Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выдаўня—XV
№ 24 (3928)
Пяцідзелак, 26 студзеня 1931 г.

Цана нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Інфармацыйнае паведамленьне

20-24 студзеня 1931 году адбыўся чарговы пленум Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б.

Пленум разглядзеў пытаньні: 1) аб кантрольных лічбах народнае гаспадаркі і культуры БССР на 1931 год; 2) аб сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і веснавой пасеўнай кампаніі; 3) аб рабочым забесьпячэньні і аб рабоце спажывецкай кааперацыі і 4) інфармацыйнае паведамленьне Наркамгандлю аб ходзе загатовак.

Пастановы, прынятыя пленумам па гэтых пытаньнях, будуць апублікаваны ў друку.

Пленум аслабаніў тав. Сяньковіча ад абавязкаў члена бюро ЦК, згодна яго заявы.

Склад членаў бюро ЦК КП(б)Б папоўнены т. т. Чарнушэвічам і Кавальчуком, якія адна асова зацьверджаны членамі сакратарыяту ЦК КП(б)Б. Кандыдатамі ў члены сакратарыяту ЦК КП(б)Б зацьверджаны т. т. Гурыновіч і Палякоў.

Па-бальшавіцку ўзяцца за справу кантрактацыі

Сьнежаньскі пленум ЦК УсеКП(б) у сваіх пастановах падкрэсьліў, што «завяршэньне фундаманту сацыялістычнае эканомікі ў трэцім годзе пяцігодкі палкам будзе залежыць ад нашых посьпехаў у галіне сацыялістычнае рэканструкцыі вёскі».

Таму вакол задач сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі павін на быць зараз мабілізавана ўвага ўсёй партыі, усяе рабочае клясы.

Адной з важнейшых задач палітыкі партыі на вёсцы зьяўляецца вытварэньне змычкі рабочае клясы з бядняцка-серадняцкімі масамі селяньства. Сацыялістычная кантрактацыя, як адзін з магутных сродкаў па сацыялістычнай і тэхнічнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, на ўцягненьні ў калгасы мільёнаў новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак — вось лепшая форма гэтае змычкі.

Вялізарныя дасягненьні партыі ў рэканструкцыі с.-гаспадаркі даюць нам магчымасьць ужо ў гэтым годзе ахапіць кантрактацыяй у збожжавых раёнах усе пасевы калгасаў і адпаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а таксама таварную частку пасеваў калгасаў і адпаасобных гаспадарак у нязбожжавых раёнах.

Апублікаваная ў друку адозва Саюзнага ўраду і ЦК УсеКП(б) аб правядзеньні кантрактацыі яравых пасеваў 1931 году разгортвае вялізарную праграму пашырэньня тэхнічнае базы сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі і дапамогі яму з боку дзяржавы.

Паводле гэтых дырэктыў, у 1931 годзе кантрактацыяй будзе ахоплена значная большасьць пасеваў збожжавых культур (51 млн. гэкт.). Поўнасьцю будзе ахоплена кантрактацыяй плошча пасеваў буракоў і бавоўны ў калгасах і бядняцка-серадняцкіх гаспадарках. **Кантрактацыя пасеваў ільну ахопіць 2 млн. 350 тыс. гэктараў, а канапель — 700 тыс. гэктараў.**

Матар'яльная і тэхнічная дапамога сельскай гаспадарцы з боку дзяржавы ў гэтым годзе дасягне вялізарнейшых разьмераў. У сельскую гаспадарку пакіроўваецца 120 тыс. трактараў коштам у 200 млн. рублёў. Машына-трактарныя станцыі вясною 1931 году апрацуюць 18 млн. гэкт. замест 4 млн. у мінулым годзе. Адных с.-г. машын будзе пакіравана на 760 млн. руб. Забесьпячэньне мінеральнымі ўгнаеньнямі павялічыцца амаль у 4 разы. Акрамя таго для кантрактантаў будзе выдана 355 млн. руб лёў авансам і значная колькасьць прамтавараў па танных цэнах.

Пералічаныя вышэй грандыёзныя мерапрыемствы па дапамозе сельскай гаспадарцы з боку дзяржавы сталі магчымы ў выніку выкананьня і перавыкананьня праграмы першых двух год пяцігодкі, у выніку правільнай палітыкі партыі па максымальным разгортваньні тэмпаў індустрыялізацыі краіны.

Ва ўмовах БССР асабліва значэньне набывае кантрактацыя **тэхнічных культур**, плошча пасеваў якіх у гэтым годзе значна павялічваецца — плошча ільну — на 80 проц. і плошча канапель — на 100 проц. у параўнаньні з мінулым годам.

20 машына-трактарных станцый, якія зараз арганізуюцца ў БССР, — вось база, на аснове якой вясной гэтага году будзе разгортвацца значна большыя тэмпамі калектывізацыя і спэцыялізацыя сельскай гаспадаркі БССР.

Перад партыйнымі і савецкімі арганізацыямі БССР як у цэнтры, так і на месцах у раёнах, зараз паўстае **адказьнейшая задача па практычнай рэалізацыі дырэктыў партыі і ўраду па правядзеньні ў жыцьцё пляну кантрактацыі 1931 году — гэтага важнейшага палітычнага і гаспадарчага мерапрыемства.**

Уся работа павінна быць праведзена з такім разьлікам, каб пляны кантрактацыі яравых пасеваў у самы кароткі тэрмін былі даведзены да калгасу і вёскі. Наркамземам і Наркамгандлю павінны быць ужыты рад мерапрыемстваў, якія б забясьпечылі пасьпяховае выкананьне плянаў кантрактацыі.

Вакол кантрактацыі трэба зараз жа разгарнуць шырокую растлумачальную кампанію **сярод калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.** У гэтым годзе ні ў якім разе не павінны быць дапушчаны намылкі мінулых год, калі ў радзе месц кантрактацыйныя дагавары заключаліся бяз удзелу шырокіх мас калгасьнікаў і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і зводзіліся да простага фармальнага падпісаньня дагавору.

Пляны кантрактацыі, ільготы кантрактантам, дапамога ім з боку дзяржавы—трэба шырока абмеркаваць на сходах калгасьнікаў і адпаасобнікаў беднякоў і сераднякоў.

Пляны кантрактацыі, кожнага калгасу, кожнага прасьпейшага вытворчага кааперацыйнага аб'яднаньня, кожнае вёскі павінны быць самым цесным чынам увязаны і зьяўляцца сустаўной часткай плянаў правядзеньня другой бальшавіцкай вясны і разгортваньня калгаснага прыліву.

У часе заключэньня дагавораў па кантрактацыі мы сустрэнемся з супраціўленьнем кулацтва, якое будзе імкнуцца зрываць нашы пляны.

Бязьлітасна ўдарыць па кулаку і яго агентуры — на правых і «левых» апартуністах—гэта важнейшая ўмова посьпеху кантрактацыйнай кампаніі.

Арганізацыі КП(б)Б павінны мабілізаваць бядняцка-серадняцкія масы на поўнае выкананьне плянаў кантрактацыі, павінны «растлумачыць масам рабочых і сялян значэньне прадаўжных савецкай уладай мер на тэхнічным пераўзбраеньні і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, стаць на чале новага ўздыму калгаснага руху мільённых мас вёскі і забясьпечыць тым самым рашаючыя посьпехі ў справе ліквідацыі кулацтва і сацыялістычнай перабудовы вёскі».

Падрыхтоўка інтэрвэнцыі супроць СССР

НА ПОУНЫМ ХАДУ

ГЕНЭРАЛ ГУРО—ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧЫ ПОЛЬСКА-РУМЫНСКІХ ВАЕННЫХ СІЛ

РЫМ, 23. Італьянскі друк паведамляе з Жэневы падрабязнасьці заключэньня польска-румынскага ваеннага дагавору. З аўтарытэтных крыніц карэспандэнт паведамляе, што вышэйшае камандваньне польскай і румынскай арміяці перадана францускаму генэральнаму штабу. «І так,—працягвае карэспандэнт,—гэты вучастак усходняй Эўропы будзе знаходзіцца ПАД КАНТРОЛЕМ ФРАНЦЫІ, на падабенства таго, як вярхоўнае камандваньне вайскамі Малой Антанты даручана ФРАНЦУСКАМУ ГЕНЭРАЛУ ПОЛЬЛЕ. Месцам знаходжаньня новага аб'яднанага камандваньня арміямі Польшчы і Румыніі намечан БУХАРЭСТ. А САМО ВЯРХОЎНАЕ КАМАНДВАНЬНЕ ДАРУЧАНА ГЕНЭРАЛУ ГУРО, які ў бліжэйшыя дні накіроўваецца ў румынскую сталіцу. (ТАСС).

НОВЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ФАШЫСЦКАГА УРАДУ ПА БАРАЦЬБЕ З РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ РУХАМ

Польскі фашызм у барацьбе з рэвалюцыйным рухам працоўных мае Польшчы і нацыянальна-вызваленчым рухам у Зах. Беларусі і Зах. Украіне на сьпяецца ні перад яміі/мэтадамі і сродкамі. Для задушэньня гэтага руху фашызму мала ўжо жудаснага тэрору, ад якога ледзянее кроў ў жылах, мала нечалавечых катаваньняў сваіх ахвяр на дэфэнзывах, неадвальнае яго правакацыйная работа хмары сышчыкаў і дэфэнзыўшчыкаў і інш, якімі, як павуціньнем, пакрыта ўся Зах. Беларусь і Зах. Украіна.

У апошнія часы для барацьбы з рухам «выротовым» (рэвалюцыйным) створана спэцыяльная дарожная паліцыя, якая правярае ўсіх праезджых па дарозе. Зараз, як падае эндэцкі «Дзеньнік Віленскі», ухвалена ўрадам асобная пастанова аб выдачы асабістых пасьведчаньняў. Паводле гэтай пастановы ўсе жыхары падзяляюцца на **стałых і нясталых.** І вось, пасьведчаньні асабістыя, на падставе гэтай пастановы фашысцкага ўраду, будуць выдавацца **толькі сталым жыхаром.**

Ясна, што гэта пастанова накіравана выключна супроць рабочае клясы, для палягчэньня фашызму барацьбы з рэвалюцыйным рухам. У фашысцкай Польшчы без асабістых пасьведчаньняў нельга ступіць і кроку, бо калі нават сялянін у роднай вёсцы выйдзе на вуліцу без такога пасьведчаньня і, калі трапіць на зубы паліцэйскаму, дым тут-жа вырыштоўваецца. Таму асабліва востра адчуваецца гэта пастанова іменна пралетарамі, мільёны якіх зараз літаральна апынуліся на вуліцы і галадаюць, а цяпер, на падставе гэтай пастановы, пазбаўлены магчымасьці пераезду з гораду ў горад для адшуканьня сабе працы.

Але дарэмная спроба. Польскаму фашызму ня спыніць рэвалюцыйнага руху працоўных мас.

МІЛІТАРЫЗАЦЫЯ ФАШЫСЦКАГА АПАРАТУ ПАШЫРАЕЦЦА

У мэтах падрыхтоўкі ўзброенага нападу на СССР, польскі фашызм, як мы ўжо на раз адзначалі на старонках «Зьвязды», праводзіць прыспешанымі тэмпамі мілітарызацыю ўсяго свайго апарату, пачынаючы ад самага ўраду і да гмінных пісароў уключна. Мілітарызаваны чыгункі, паліцыя, турэмны нарсагал, суды і г. д.

Так, апошні нумар ўрадавага «Польскага Монітору» паведамляе, што старшынёю суда ў мястэчку Косаве (Зах. Беларусь) прызначан майёр 3-га артыпярыйскага палка В. Ліпскі, палкоўнік запасу І. Гэрманоўскі прызначан наморнінам павятовага суда ў Лодзінскай акрузе, Н. Пілюкоўскі — ротмістр запасу прызначан наморнінам павятовага суда ў тэй-жа Лодзінскай акрузе і г. д.

Гэтыя пералічаныя фактаў зьяўляюцца надзвычай характэрнымі. Яны праліваюць яркае сьвятло на тую мілітарызацыю, якая праводзіцца фашысцкім урадам ва ўсіх галінах народнага жыцьця.

Крызіс францускага ўраду

ПАРЫЖ. Паводле паведамленьня агенцтва «Гавас», габінэт Стэга 22 студзеня падаў прэзыдэнту Думэргу заяву аб адстаўцы.

***

ПАРЫЖ, 24. Як і можна было чакаць, БРЫЯН адхіліў зробленую яму прапанову аб стварэньні ўраду. Як сьцьвярджаюць у блізкіх Брыяну колах, Брыян заявіў прэзыдэнту рэспублікі Думэргу, што яму было-б немагчыма адначасова выконваць абавязкі прэм'ера і міністра замежных спраў. Распаўсюджваньне падобных паведамленьняў указвае, што пытаньне аб тым, каб пакінуць Брыяна на пасадзе міністра замежных спраў пры любой урадавай камбінацыі можна лічыць наперад вырашаным.

Пасьля адмаўленьня Брыяна фармаваць урад Думэргу запрапанаваў зрабіць гэта сэнатару ЛАВАЛЮ (беспартыйны, блізкі да радыкалаў). Як вядома, аналягічнае даручэньне давалася Лавалю пасьля адстаўкі габінэта Тардзье ў сьнежні. Аднак, у той час Лавалю не ўдалося стварыць міністэрства з прычыны адмаўленьня радыкалаў супрацоўнічаць з Тардзье, на чым настойваў Лаваль. Ня гледзячы на нядаўнюю няўдачу, Лаваль і на гэты раз згадзіўся папрабаваць стварыць міністэрства. (ТАСС).

Ленінскія дні за мяжою

ВЭРЛІН, 24. Паводле паведамленьня «Юмэніта», мітынг, прысьвечаны гадавіне сьмерці Леніна, у Парыжы прайшоў з вялікім посьпехам. Ня гледзячы на вельмі вялікі дождж, на мітынг сабралося каля 12 тыс. рабочых, з якіх 3 тыс. з прычыны перапоўненасьці памяшканьня, засталіся на вуліцы. Удзельнікі мітынгу сустрэлі доўгімі воплескамі ўзьнішоўшага на трыбуну Марты, які падаўна вышаў з турмы. Тав. Марты даў адказ на напады сацыялістаў у сувязі з галасаваньнем камуністычнае фракцыі ў парляманце супроць давер'я ўраду Стэга. Прамова тав. Марты была прысьвечана пагрозе вайны супроць Савецкага Саюзу і дасягненьням сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР.

Другі прамоўца — тав. Торэс спыняецца на асноўных прынцыпах ленінізму і падкрэсьлівае вялізарную важнасьць умацаваньня масавай работы кампартыі і рэвалюцыйных прафсаюзаў.

Наступны прамоўца — тав. Дорыё гаворыць аб змаганьні працоўных мас у калёніях. Ён зварачае ўвагу на тое, што ў Інда-Кітаі зараз 86 рэвалюцыянэраў прысуджаны на кару сьмерцю, а 1.100 пакутуюць у турмах.



ЭКАНАМІЧНЫ КРЫЗІС У ПАЗШ. Капіталістычны сьвет задыхаецца ў ціскох найглыбейшага эканамічнага крызісу. Цэны на тавары бесьперапынна падаюць. Мільёны беспрацоўных галадаюць.

На здымку: Ня гледзячы на голад мільёнаў беспрацоўных, у Паўднёвых штатах Амэрыкі замест вугалю палаць пшаніцай.

СУПРОЦЬ ЦКАВАНЬНЯ М. ГОРКАГА

Адозва IX зьезду УсеЛКСМ

IX зьезд УсеЛКСМ, на прапанове тав. Кіша, 21 студзеня пад бурныя воплескі ўсіх дэлегатаў, прыняў адозву да Максіма Горкага. У адозве гаворыцца:

«IX зьезд УсеЛКСМ з абурэньнем даведаўся аб тым цкаваньні, якое вядзе супроць цябе прэса буржуазнага сьвету. Мы дасканала разумеем, што хлусьня і паклёпы, накіраваныя супроць цябе, зьяўляюцца толькі часткаю тэй хлусьні і паклёпаў, якімі буржуазныя пісакі аблываюць наш вялікі Савецкі Саюз. Мы дасканала разумеем прычыну гэтай шалёнай злосьці буржуазіі і не адпетай.

Ад імя 3 мільёнаў камсамольцаў мы заяўляем табе, дарагі Аляксей Максімавіч, што ты для нас ня толькі верны пралетарскі пісьменьнік, любімы і паважаны усёй рабочай і сялянскай моладзьдзю нашай краіны; мы глядзім на цябе, як на пораданога салдата савецкай краіны які абараняе не гонар і правату перад працоўнымі ўсяго сьвету. Мы дружна паціскаем тваю руку і горача вітаем тваё мужныя выступленьні на абарону СССР, супроць шкоднікаў і інтэрвэнтаў. Мы далкам падтрымліваем тваю заяву аб тым, што калі вораг не адпадзе, яго трэба зьнішчыць».

ХВАЛЯ ГНЕВУ І АБУРЭНЬНЯ працоўных мас БССР

супроць крывавага тэрору польскай паліцэйшчыны ў Зах. Украіне і Зах. Беларусі

У адказ фашысцкіх катам—усе, як адзін, уступаюць у рады МОПР'у

Агульны сход рабочых і служачых заводу «Чырвоная Зара» і сьпіртзаводу, на ўрадзіная рэзалюцыі - пратэсту супроць фашысцкага тэрору ў Зах. Украіне і Зах. Беларусі адзначае:

— Сусьветны капіталізм уступіў у паласу нябывалага эканамічнага крызісу; асабліва цяжка гэты крызіс адчувае фашысцкая Польшча. Ня марачы пякага выхаду са створанага эканамічна-палітычнага становішча, польскі фашызм крывавым тэрорам, які па сваіх мэтадах катаваньня перавышае гітлераўскую інквізыцыю, імкнецца задушыць рабочы і сялянскі рух, задушыць рэвалюцыйную барацьбу працоўных за іх вызваленьне з-пад польска-панскага ярма.

Агульны сход выказвае свой горачы пратэст супроць нячуванай барбарскай расправы польскага фашызму над беларускім рабоча-сялянскім клюбам «Змаганьне».

Рабочыя заводу «Чырвоная зара», у адказ на фашысцкі тэрор і падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР, абяцаюць разам з рабочай клясай СССР згуртаваць свае рады вакол камуністычнай партыі і аддаць усе сілы на выкананьне пяцігадовага пляну за чатыры гады, на пабудову сацыялізму.

Апачасова агульны сход пастанаўляе ўсім рабочым і служачым заводу ўступіць у рады МОПР'у, ліквідаваць усю сваю запазычанасьць гэтай арганізацыі і выклікаць рабочых усіх заводаў гораду Менску пасьледваць іх прыкладу.

Нахай жыве сусьветная рэвалюцыя!

Прэч польскі фашызм!

Наша брацкае прывітаньне барацьбітом рэвалюцыі ў Зах. Украіне і Зах. Беларусі!

Рэвалюцыйнага руху тэрорам польскаму фашызму ня задушыць

Заслухаўшы інфармацыю аб зьверствах польскага фашызму над рэвалюцыйным пралетарыятам і сялянствам Зах. Беларусі і Зах. Украіны, аб страшэнным катаржным прысудзе над былымі паслямі «Змаганьне», агульны сход рабочых і служачых кандытарскай фабрыкі «10-ты Кастрычнік» выказвае свой рашучы пратэст.

Калектыў цукернікаў упэўнен, што ніякім тэрорам фашызму не задушыць узьнятай рэвалюцыйнай хвалі працоўных мас Польшчы, што жудаснымі катаваньнямі, забойствамі і арыштамі лепшых барацьбітоў за вызваленьне ад панаваньня белапалякаў на спыніць рэвалюцыйнай барацьбы супроць фашысцкай дыктатуры, за рабоча-сялянскую ўладу.

Рабочыя і служачыя цукернай фабрыкі пільна сочаць за падрыхтоўкай польскім фашызмам інтэрвэнцыі супроць СССР і па першым заклику партыі і ўлады ўсе, як адзін, стануць у першыя рады барацьбітоў на абарону краіны Савету, на абарону завяваньняў кастрычніка.

У адказ на крывавы тэрор польскага фашызму мы яшчэ больш узьнімем тэмп нашае сацыялістычнае будоўлі, і паставленыя перад намі задачы трэцяга году пяцігодкі на толькі выканаем, але і перавыканаем.

Калектыў абавязваецца ліквідаваць усю сваю запазычанасьць МОПР'у і ў далейшым актыўна ўдзельнічаць ва ўсіх кампаніях, што праводзіцца гэтай арганізацыяй. Сход пастанаўляе адзін дзень адпрацаваць на карысьць зьняволеным і іх сем'яў.

Нахай жыве сусьветны Кастрычнік!

Нахай жыве рэвалюцыйная барацьба пралетарыяту і працоўных мас Зах. Украіны і Зах. Беларусі!

Нахай жыве КПП!

Юрка Лявонны

ДВА ТЫДНІ

Паэты плакалі
над словам «Беларусь»,
Яго ў крыжы
ды вярокі завінуўшы—
І над краінай
чорную зару
Пасланць імкнуліся
ня ўдалыя клікушы.
«Кужэльны» край... Тут...
Балота... Гніль...
І ты, падняўшы
стомленыя рукі,
Паводле іхнай
воражай хлусьні
Ішла на кроў
на попел і на мукі...
Дык прэч ману!
Краіна Асіністаў,
Краіна гмахаў
творчасьці і мар
Гарыць будоваю...
Гарэць не перастане!
І ворагам прытулку
ў ёй няма.
У буйным сэрцы
новых парывальнаў,
Дае пульс рэспублік
бьецца ля старта,
Ты паказала
вынікі змаганьня
Народжанай ў бурах
старана!
У гэты тыдзень
бачылі народы,
што насяляюць
моцны наш Саюз,
Як, перайшоўшы
хібы і прыгоды,
Куеш ты долю
сьветлую сваю.
Дзе плакаў бор—
Стаім слубой,
Дзе кроў лілі—
Гудуць палі;
Які размах!
За гмахам-гмах...
Нязрушныя намерамі
Ляцім цэнер наперад мы,
І гэты тыдзень—сымвалъ быў
Зьяднаньняў і барацьбы!..

***

А там, на крэсах,
ноччу цёмнай
Здаецца дзень
нямых пакут...
І хвалі
скутанага Нёмну
Трывогай блізкаю
пякуць.
Таксама «тыдзень»!
Фаро судовы,
Дзьве пары сьведкаў
за пятак—
Прысуд бязьлітасны
гатовы
Жыцьця старонку
загартаць...
Паўсотні год
няволі, гэуму
Паслом «Змаганьня»
перажыць...
Ня зьнішчаць
сонечныя думы
Ні шал, ні краты
ні крыжы!
Пальцеца водгульле
набата,
Як помсты клясавай
закон,
Над ботам
польскага магната
І фашыстоўскім
кулаком!
Іграй зару,—
Пад сьпевы труб
Агней часы—
У палі, ляся!
Калі краіна ў зорах—
Сухім трымайце порах!
Прадонькі Беларазка
Свавольлем замяцаюць,
І рана там, ці позна—
Паўстануць давяй гронай
На ўціскі і на турмы
Аноншім, страшным штурмам!

14-1—31.

ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б

Жалобнае пасяджэньне пленуму Менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б, гарадзкога кантрольнай камісіі, гарадзкога савету, ЦСПСБ разам з партыйным і прафэсіянальным актывам, прысьвечанае сёмай гадавіне са дня сьмерці Леніна, шле гарачае бальшавіцкае прывітаньне ленінскаму ЦК УсеКП(б), ленінскаму з лепшых ленінцаў — тав. Сталіну і Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б.

Ленінская партыя—партыя вапўнічага бальшавізму, страціўшы сем год таму назад свайго найвялікшага арганізатара, настаўніка і правадыра, на працягу ўсяго перыяду ў сваім змаганьні і дзейнасьці ні на крок ня ўхілася з таго шляху, які паказаў Уладзімер Ільліч. УсеКП(б) пад кіраўніцтвам свайго ленінскага ЦК, на чале з тав. Сталіным, прывяла краіну пралетарскай дыктатуры ў перыяд сацыялізму, у перыяд завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР.

На аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, у выніку выкананьня ў аснову ленінскага пляну электрыфікацыі, гігантскі вырасла індустрыялізацыя — база і жывацворчая крыніца магутнасьці сацыялістычнай прамысловасьці СССР. За першыя два гады пяцігодкі сацыялістычная дзяржаўная прамысловасьць дала народнай гаспадарцы прадукцыі на 30,5 мільярдаў руб. замест 29,3 млр. р., якія прадугледжваліся пяцігадовым пляном. Асабліва вялікія посьпехі дасягнуты ў развіцьці тых галін прамысловасьці, якія вырабляюць сродкі вытворчасьці: за першыя 2 гады пяцігодкі цяжкая індустрыя дала краіне прадукцыі на 13,8 млр. руб. замест 12,5 млр. руб., што прадугледжваліся пяцігадовым пляном.

На базе шпаркага разгортваньня сацыялістычная індустрыі, якой належыць вядучая роля ва ўсёй сыстэме разьвіцьця народнай гаспадаркі Савецкага Саюзу, шырока разьвіваецца сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі. Партыя ад лезунгу абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулацтва прыступіла да ліквідацыі кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі. Асноўныя масы працоўнага сялянства сталі на шлях калектывізацыі. Рабочая класа і бядняцка-серадняцкія масы сялянства пад цьвёрдым кіраўніцтвам сваёй бальшавіцкай партыі дабіліся гігантскіх посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. У асноўных збожжавых раёнах процант калектывізацыі дасягне 50, сацыялістычны сэктар даў 36 проц. усёй таварнай збожжавай прадукцыі ў 1930 г. На базе будаўніцтва буйных калгасаў і саўгасаў у асноўным вырашана збожжавая праблема.

Гэтыя гігантскія посьпехі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва партыяй набыты толькі таму, што яна з ленінскай непрымірымасьцю вяла бязьлітаснае змаганьне супроць правых і «левых» апартуністаў і прымірэнцаў да ўхілаў ад ленінізму. Гэтыя посьпехі сталі магчымы толькі таму, што партыя ідэйна — арганізацыйна разграміла контр-рэвалюцыйны трацкізм, нанесла руйнуючы ўдар бясспрынцыпнаму праваканскаму «ліквацкаму» блёку двурушнікаў і здрадніку партыі. Гэтыя посьпехі партыя набыла толькі таму, што на працягу ўсяго перыяду свайго змаганьня і дзейнасьці трымала высока ленінскі сьцяг бальшавіцкай партыйнасьці і беспаваротна выганяла са сваіх радоў агентаў варожай клясы — правых і «левых» апартуністаў, рэнегатаў пралетарскай рэвалюцыі.

У той час, калі СССР шырока разгарнуў будаўніцтва сацыялізму, калі ў Савецкім Саюзе ў асноўным ліквідавана беспрацоўе, — капіталістычны сьвет знаходзіцца ў ціскох цяжкага эканамічнага крызісу, у коле непрымірымых клясавых супярэчнасьцяў. Эканамічны крызіс у капіталістычных краінах усё пагмыбяецца. Расьце зьбяднеьне рабочых і працоўных мас. Беспрацоўе дасягнула вялізарнейшых разьмераў. Фашысцкая рэакцыя ліквідуе ўсялякія спробы рабочых мас падняць свой голас пратэсту супроць улады капіталістаў. Капіталістычныя краіны шалёнымі тэмпамі падрыхтоўваюць вайну супроць краіны, дзе пераможна будуецца сацыялізм, супроць сацыялістычнай бацькаўшчыны пралетарыяту ўсяго сьвету. Ня гледзячы на жудасны тэрор, расьце канспірацыя сіл міжнароднага пралетарыяту, мацнее іх згуртаваньне вакол камуністычных партый. Рэвалюцыйны рабочы рух усё больш і больш пашыраецца.

Агенты сусьветнага капіталізму — шкоднікі, контр - рэвалюцыянэры — падрыхтоўвалі інтэрвэнцыю. Пралетарыят адсек лапы гадзіне контр-рэвалюцыі і ў адказ на іх агідныя замыслы адказаў узмацненьнем абароназдольнасьці краіны, пралетарскай дыктатуры, адказаў узмоцненьнем базавой магутнасьці Чырвонай арміі. Пралетарыят Савецкага Саюзу ў адказ на спробы падрыхтоўваць інтэрвэнцыю з боку так званай «прампартыі» адказаў узмацненьнем свайго змаганьня за пашырэньне і павышэньне тэмпаў індустрыялізацыі СССР.

Камуністычная партыя бальшавікоў Беларусі — верны атрад непахіснай і маналітнай УсеКП(б) — на працягу ўсяго часу няўхільна ажыцьцяўляла ленінскую генэральную лінію партыі, вяла бязьлітаснае змаганьне на два фронты супроць правага апартунізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» загібаў і прымірэнцтва да ўхілаў ад лініі партыі. КП(б)Б, апіраючыся на актыўнасьць шырокіх пралетарскіх і бядняцка - серадняцкіх мас, дабілася грандыёзных посьпехаў у справе разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці БССР. Гэтыя посьпехі надзвычайна ўзняла-б тым, што валавая прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці вырасла на 68 проц., што значна перавышае процант, запраектаваны пяцігодкай. Капітальнае будаўніцтва за апошні год выкананае на суму 44 млн. руб. Рабочая класа БССР вырасла на 32 проц. Набывала ўзрост сацыялістычны сэктар у сельскай гаспадарцы. Калектывізацыя бядняцка-серадняцкіх гаспадарак дайшла да 15 проц. На базе ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі аб суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца кулацтва як класа.

У выніку ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі КП(б)Б надзвычай шырока разгарнула работу на нацыянальна-культурным будаўніцтве ў БССР. У гэтых адносінах КП(б)Б мае надзвычай вялікія посьпехі. У БССР зараз налічваецца 12 вышэйшых навучальных устаноў, а посьпехам ажыцьцяўляецца ўсеагульнае абавязковае навучаньне, ліквідуецца непісьменнасьць, расьце сетка тэхнікумаў, сямігадовых і начатковых школ. Гэтыя посьпехі дасягнуты ў бязьлітасным змаганьні супроць розных ухілаў у цытаньнях нацыянальнай палітыкі і ў першую чаргу супроць вялікадзяржаўнага шавінізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму і яго агентуры ў радах партыі — нацыянал-анархізму і шавінізмаў розных колераў.

Пралетарыят Савецкай Беларусі, калгасьнікі і бядняцка - серадняцкія масы сялянства сустрэлі сёмую гадавіну сьмерці свайго правадыра яшчэ больш згуртаваньнем вакол партыі Леніна, яшчэ большым павышэньнем сваёй актыўнасьці, творчага энтузіязму і энэргіі, накіраваных на поўнае пераўтварэньне ленінізму ў канкрэтную справу — сацыялізм.

Энтузіясты пяцігодкі—рабочыя - ударнікі, перадавыя, актыўнейшыя багракі і калгасьнікі, ажыцьцяўляючы ідэю Ільліча аб сацыялістычным спаборніцтве, адзначаюць сёмую гадавіну сьмерці свайго правадыра масавым уступленьнем у рады бальшавіцкай партыі, каб яшчэ больш умацаваць яе сталёвае адзінства і бальшавіцкую непахіснасьць, каб быць у першых радах барацьбітоў за поўную перамогу сацыялізму.

Пленум гаркому КП(б)Б, гарадзкой кантрольнай камісіі, гарсавету, ЦСПСБ і партыйны актыў Менскай гарнартарганізацыі запэўніваюць ленінскі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б у тым, што яшчэ больш узмоцняць свае змаганьне за генэральную лінію партыі супроць усякіх праўзьленьняў правага і «левага» апартунізму ў творы і на практыцы, супроць прымірэнцтва. Менская гарадзкая партарганізацыя, а пад яе кіраўніцтвам і ўся рабочая класа пралетарскай сталіцы БССР і самыя шырокія масы яшчэ з большым энтузіязмам будуць змагацца за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, за выкананьне базавой праграмы сацыялістычнага наступленьня, вызначанай на трэці год пяцігодкі. Рабочыя масы пад кіраўніцтвам партыі Леніна прыкладуць усе свае намаганьні на фронце змаганьня за перамогу сацыялізму.

Партыйныя арганізацыі на прадпрыемствах яшчэ на большую вышыню ўзьнімуць палітычную актыўнасьць і творчую энэргію мас і накіруюць яе на поўнае выкананьне наказу дарагога правадыра і настаўніка Уладзімера Ільліча Леніна. Партыйныя арганізацыі яшчэ больш узмоцняць наступленьне на кулацтва — апошнюю апору капіталістычнай інтэрвэнцыі ўнутры СССР, да поўнай яго ліквідацыі як класа на базе суцэльнай калектывізацыі. Пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго партыі бядняцка - серадняцкія масы вёскі яшчэ больш узмоцняць сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

У сёмую гадавіну з дня сьмерці Ільліча мы клянемся з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю ажыцьцяўляць яго наказы і гэта будзе самым лепшым помнікам тав. Леніну—правадыру сусьветнага пралетарыяту.

Ленін — сьцяг будучага. Пад гэтым сьцягам прыпечанае чалавецтва пераможа сьвет уціску і галечы.

Ленін вывеў пралетарыят і працоўныя масы былой Расіі на верны шлях да камунізму.

Бяз страху і сумненьня рабочыя масы і масы бядняцка-серадняцкага сялянства, пад кіраўніцтвам УсеКП(б), будуць ісьці на гэтым шляху змаганьня і жорсткіх клясавых баёў да поўнай перамогі сацыялізму.

Ужо 7 год, як няма сярод нас Уладзімера Ільліча Леніна. Але жывуць сталёвыя рады рабочых і сялян, якія пад кіраўніцтвам вернай наказам Ільліча камуністычнай партыі зьмяцуць з зямлі экспляататараў і ўціск і ўзьдымуць сьцяг камунізму над усім сьветам.

Нахай жыве партыя Леніна!

Нахай жыве яе Цэнтральны Камітэт —кіруючы штаб пераможнага сацыялістычнага наступленьня!

Нахай жыве верны ленінец і загартаваны бальшавік—тав. Сталін!

Нахай жыве КП(б)Б і яе Цэнтральны Камітэт!

Нахай жыве ленінізм, які перамагае і пераможа на ўсім сьвеце!

III-ці ПЛЕНУМ ЦКК КП(б)Б
— СКЛІКАЕЦЦА —
НА 10-га ЛЮТАГА 1931 ГОДУ
ЦКК КП(б)Б.

Разгром органу „Хлопскае жыцьцё"

Як падае «Дзеньнік Віленскі» ад 16-га студзеня, па загадзе судовых органаў паліцыя разграміла часопіс «Хлопскае Жыцьцё»—орган аб'яднанай сялянскай партыі «Самадапамогі». Пры разгроме рэдакцыі арыштаваны на месцы: М. Зайцаў і З. Гельдфінгэр—студэнты Краўскага ўнівэрсытэту, М. Дэўтшэр, С. Кендзэрскі—былы сэнатар і прысуджаны ў готы час у рэдакцыі жанчыны С. Якубоўская.

Менскі Гарадзкі Камітэт КП(б)Б склікае на сёньня, а 6 гадз. вечара ў Доме Камасьмолы (калб К. Маркса)

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД ПАРТАКТЫВУ

з парадкам дня:

„Вынікі студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б

—дакл. тав. Шаранговіча.

На партактыў запрашаюцца: члены і кандыдаты ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б, члены фракцый прэзыдыуму ЦСПСБ і гарсавету, прадстаўнікі на сваіх кандыдатах.

Для партыйнага актыву, прапануецца сакратарам вячэек КП(б)Б атрымаць білеты ў гаркоме 25-га студзеня з 12-ці да 4-х гадз. дня і 26-га студзеня з 9-ай да 4-х гадз. дня (пакой № 10).

Гаркам КП(б)Б

ТРЫВОЖНЫ СЫГНАЛ З БАРЫСАВА

Раённае парткіраўніцтва не забясьпечвае выкананьня задач трэцяга году пяцігодкі

На радзе прадпрыемстваў буйныя прарывы. Калектывізацыя праходзіць самацёкам. Факты грубага заціску самакрытыкі

На канкретных выніках, лічбах і фактах выкананьня пастаўленых партыяй задач, сацыялістычнага будаўніцтва ацэньваецца работа ўсіх зьвенняў партыйнай арганізацыі, іх баяздольнасьць, уменьне змагацца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы за высокія тэмпы індустрыялізацыі, разьвіцьця прамысловасьці, за сацыялістычную перабудову сельскае гаспадаркі і ліквідацыю кулацтва, як класу, на аснове суцэльнае калектывізацыі. На канкретных выніках гэтае работы ацэньваецца наколькі гэта ці іншая партарганізацыя, парткалектыў, яўлена стаіць на чале актыўнасьці рабочых мас і бядняцка-серадняцкага сялянства, як мабілізуе і накіроўвае гэту актыўнасьць на практычнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, на перамогу трудзяшчагося нашага росту, на бязьлітаснае змаганьне супроць клясавага ворага і яго агентуры ў радах партыі — правага і «левага» апартунізму.

Падыходзячы з гэтага пункту погляду да ацэнкі работы Барысаўскай раённай партарганізацыі, прыходзім да высноваў, што кіраўніцтва — **Барысаўскі райком** КП(б)Б—ня справіўся з работай на важнейшых участках, не мабілізаваў, як належыць, раённай партарганізацыі на выкананьне задач, вызначаных партыяй на трэці рашаючы год пяцігодкі.

Перабудова партработы ў стадыі разважаньняў

Важнейшай умовай выкананьня грамфінпляну, выкананьня плянаў калектывізацыі сельскае гаспадаркі ацэньваецца перабудова партработы за ўсіх зьвеннях раённай арганізацыі ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду. Аднак гэта пытаньне ягнае да этага часу знаходзіцца ў стадыі разважаньняў. **Партработа на большасьці прадпрыемстваў гор. Барысава не перабудавана.** Райком партыі самога гэта пытаньне паставіў толькі ў канцы сьнежня. Нарада сакратароў вытворчых парткалектываў і цэх'ячэек, якая адбылася 19-га студзеня, паказала, што **ня толькі не перабудавана партработа, а ў радзе ячэек няма правільнага разуменьня значэньня гэтай перабудовы.** Інфармацыя амаль усіх сакратароў шодзілася да паведамленьняў аб «разьмеркаваньні» партыйнага актыву на сэкцыях пры бюро партарганізацыяў, аб роспуску сэкцыяў у радзе цэх'ячэек і вылучэньні «лекцыёраў».

На фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская перамога» заамест 10 проц. сабекошт зьніжаны толькі на 2 проц.

Работы за узмацненьне працоўнай дысцыпліны партыйныя калектывы і ячэйкі ня ўзьнялі на прынцыповую вышыню, не мабілізавалі рабочай грамадзкасьці **на барацьбу супроць прагулаў і прастою.** У выніку — колькасьць прагулаў за асобны квартал у параўнаньні з мінулым годам ня толькі ня зьменшылася, а ў радзе месц мела тэндэнцыю да павялічэньня. Так, на гуце імя Домбаля колькасьць прагулаў павялічылася ва ўдарным квартале супроць 1929-30 года на 231 проц., на «Прафінтэрне» — на 230 проц., на «Камінтэрне» — 14,5 проц., прастоі на гэтым заводзе за 1929-30 г. складалі 474 варыятата-гадзіны, а за ўдарны квартал — 712. Прагулы за 9 месяцаў мінулага году на фабрыцы «Пралетарская перамога» складалі 758 чалавека-дзён, а за 2 месяцы асобнага кварталу — 330, на «Чырвонай Бярэзіне» адпаведна гэтым пэрыядам 888 чалавекадзён і 167, на прадпрыемствах гаркамбінату — 372 чалавекадзён і 90.

Пад'агульныя вынікі выкананьня грамфінпляну за асобны квартал, **пленум Барысаўскага райкому даручыў бюро РК безадкладна абмеркаваць пытаньне аб кіраўніцтве тых прадпрыемстваў, дзе дапушчаны найбольш буйныя прарывы. З таго часу прайшло каля трох тыдняў, але райком ніякіх захадаў у адносінах да апартунісьтычнага кіраўніцтва на прадпрыемствах ня ўжыў.** Запісалі ў пратаколе і на гэтым супакоіліся. Характэрна, што месяцы два таму назад райком прыняў пастанову аб зьмене кіраўніцтва партколектыву заводу імя Домбаля за апартуністычную практыку, але гэта пытаньне было змазана: былы сакратар парткалектыву послан на вучобу, **а нааптаванага на яго месца ў склад бюро новага сакратара да гэтага часу нават не правялі на агульным партсходзе.**

Райком нічога ня ўжыў і ў адносінах да кіраўніцтва парткалектываў тых прадпрыемстваў, на якіх ня была праведзена падрыхтоўчая работа да ўступленьня ў трэці год пяцігодкі.

У баку ад вытворчага ўздыму

Урост актыўнасьці рабочых мас у змаганьні за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, за выкананьне і перавыкананьне грамфінпляну прадпрыемствамі можна ілюстраваць шмат якімі фактамі ўзорнай бальшавіцкай работы на прадпрыемствах Барысаўшчыны, фактамі ўдарніцкага руху, неўхапнай творчай энэргіі, асабліва старых кадраў рабочых і пралетарскай моладзі.

Гэта вытворчая актыўнасьць ня выкарыстана для выкананьня і перавыкананьня грамфінпляну.

Наколькі слаба паставлена работа многіх парткалектываў на выкананьні вытворчых задач на прадпрыемствах сьведчыць тое, што бязьмецьсьць фабрык і заводаў гораду Барысава ня выканала грамфінпляну асобнага кварталу, ні на сэкцыйных ні на якасных паказальніках. Так, напрыклад, на фабрыцы **«Пралетарская перамога»** грамфінплян за чатыры квартал на колькасьці выкананы толькі на 78,1 проц., на **«Чырвонай Бярэзіне»**—86,6 проц., на фабрыцы **«Камінтэрн»** на лесапільнай галіне—на 82,9 проц., на фанэрнай—на 72,7 проц.

Як выкананы грамфінплян на прадпрыемствах гаркамбінату кіраўніцтва ня ведае да гэтага часу поўных цыфраў. Дрэнна выканана грамфінплян **на 10,4 проц.** падшэфны і толькі фэд. **«Прафінтэрн»** і грамфінплян на заводзе **«Рабочы»** на 4 проц. і гуце імя Домбаля на 2 проц. Трэба адзначыць, што перавыкананьне дасягнута за лік наяўнасьці на гуце **цішнай рабочай сілы.**

Ні адзін стаіць справа амаль на ўсіх прадпрыемствах і з **выкананьнем зьдаваньня па зьяўляцьці прадукцыйнасьці працы і зьніжэньні сабекошту.** На гуце імя Домбаля, дзе па колькасных паказальніках перавыкананы плян, зьніжэньне сабекошту замест 3 проц. паводле плану дасягне толькі ў кастрычніку 0,16 проц., а ў лістападзе сабекошт павялічыцца на 4 проц. На «Чырвонай Бярэзіне»: па запалках — на 86,9 проц., на сядзеньнях — на 79 проц. і на ватэрпасах — на 64 проц. У ватэрпасным цэху на працягу двух дзён-ня працавала адна зьмена з прычыны адсутнасьці гіпсу. Між тым **гіпс быў на станцыі і толькі па віне адміністрацыі фабрыкі дапушчаны перабоі ў рабоце.** На гуце імя Домбаля за гэты-ж час плян выкананы на 88 проц., на заводзе **«Камінтэрн»** плян па лесапільнай вытворчасьці выкананы на 74,2 проц., на фанэрнай на 70,6 проц. **Фанэрны цэх не працаваў два дні з-за «адсутнасьці» альховага дрэва. На справе-ж аказалася, што пасьля прастою варштатаў на дварэ заводу было знойдзена каля 600 альховых калод, якіх хапае на два тыдні работы.** Рабочыя абураны такім становішчам, калі кіраўніцтва заводу ня ведае, што робіцца ў яго над носам, а сакратар парткалектыву ня лічыць патрэбным абмеркаваць на партсходзе пытаньне аб прарывах на заводзе і ўжыць неабходныя меры для іх ліквідацыі.

Райком партыі атрымліваў весткі з прадпрыемстваў аб сходах выкананьня грамфінпляну, але заставаўся нэйтральным наглядальнікам гэтых недапушчальных зьявішч.

Калектывізацыя самацёкам

Задачы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі не зацялі патрэбнага месца ў рабоце раённай партарганізацыі. У большасьці вясковых партячэек у справе калектывізацыі панае апартуністычная стаўка на самацёк.

На 1-га студзеня калектывізавана 13 процантаў бядняцка - серадняцкіх гаспадарак раёну. **Гэта лічба для Барысаўскага раёну, які зьяўляецца прамысловым цэнтрам, дзе налічваецца каля 15 тысяч рабочых, пры наяўнасьці амаль паўтаратысячай партыйнай арганізацыі, ня можа нездавальняючая.** За час **месячнай** пасоўнай кампаніі арганізавана 10 калгасаў і два таварыствы на сумесным апрацоўцы зямлі, якія яднаюць 160 гаспадарак (у сярэднім 10-13 гаспадарак на калгас). Частка з гэтых калгасаў існуе толькі на паперы. Напрыклад, у Лошніцкім сельсавеце арганізаваныя у лістападзе калгасы «Хвала рэвалюцыі» з 11 гаспадарак і «Чырвоная мулярка» з 7-ці гаспадарак не абагулілі ні інвэнтару, ні рабочае жывёлы. На працягу гэтых калгасаў асабліва выдзяляецца апартуністычная бязьдзейнасьць з боку Лошніцкай ячэйкі. Калгас «Хвала рэвалюцыі», арганізаваны ў вёсцы Лошніца, дзе масцца каля 350 дваароў, з якіх больш 100 дваароў бядняцкіх, акалі 11 гаспадарак. Парт'ячэйка і ячэйка ЛКСМ задоволіліся 11 гаспадаркамі, якія ўнайшлі самацёкам у калгас. Гэта пры наяўнасьці калгаснага ўздыму бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Гэта ячэйка месяцы два таму назад прыняла пастанову **«усім партыйцам весьці работу сярод сялян для ўцягненьня іх у калгас», але практычна нічога ня робіцца.**

Наколькі слаба ажыцьцяўляецца кіраўніцтва калгасамі з боку парт'ячэек і раённых устаноў відаць з таго, што ні ў адным калгасе ня ўведзена зьдзельная работа. **Толькі з першага студзеня** пераведзены на зьдзельшчыну тры калгасы. Амаль ні ў адным калгасе не праводзіцца работа мэталамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Калгасы **«Барацьбіт»**, імя **Сталіна**, імя **Чарвякова, Жыткавіцкі** і іншыя з прычыны таго, што на чале іх кіраўніцтва доўгі час знаходзіліся апартуністычныя элементы, даведзены да гаспадарчага заняпаду. **З 60-ці калгасаў раёну ў 18-ці да гэтага часу не разьмяркован ураджай.** У Жыткавіцкім калгасе пілкага вучоты працы не праводзілася. У канцы гаспадарчага году **працадні разьмяркоўваліся калгасаньнем на сходзе і дагаласавалі** ся да таго, што залічвалі працадні тым асобам, якія ніколі ў калгасе не працавалі.

У калгасе **«Маяк сацыялізму»**, які знаходзіцца ў гор. Барысаве, — на вачох кіруючых раённых устаноў на працягу цэлага году тварыліся злачынствы. Развал калгасу пачаўся з таго часу, калі **РВК (у бытнасьць старшыні Валуева) санкцыянаваў прыём праўленьнем калгасу 11 кулацкіх і нэпманскіх гаспадарак.** Гэтыя кулацкія элементы, якія зусім не працавалі ў калгасе, атрымлівалі ў першую чаргу прадукты і дэфіцытныя прамтавары. Праўленьне калгасу разбазарвала маемасьць гаспадаркі, раздавала калгасьнікам сьвіней, якія нападалі на рынак. Прадуктамі з калгасу карысталіся раённыя работнікі **(Няхамкін, Будкін, Зыськін, Вэўчкоў)**, якія ніякіх адносін да маемасьці калгасу ня мелі.

Калгасьнікаў, якія шляхам самакрытыкі імкнуліся выкрыць злачынствы, кіраўніцтва калгасу называла бузацёрамі і пагражала выключэньнем з калгасу. Партыйнае кіраўніцтва раёну на гэту справу рэагавала толькі тады, калі калгас быў ужо даведзены да поўнага развалу.

За апошнія два месяцы на Бюро РК зацвуханы даклады сакратароў 8-мі вясковых парт'ячэек. Кіраўніцтва 6-ці ячэек прыцягнута да партыйнай адказнасьці: абвешчаны вымовы, некаторыя сакратары ячэек зьняты з работы, распушчаны бюро ячэек за апартуністычную практыку. Аднак на гэтых фактах не мабілізавана ў належнай меры раённая партарганізацыя для ўзмацненьня барацьбы з апартунізмам у калгасным будаўніцтве. Той факт, што адной пастановай бюро РК зьмяняе кіраўніцтва 4—5 ячэек, сьведчыць, што ў працэсе ўсёй работы партыйная арганізацыя слаба была мабілізавана райкомам на барацьбу супроць правых апартуністаў, кулацкай агентуры ў радах партыі, ня была мабілізавана на ажыцьцяўленьне задач партыі па калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

„Апратэставаць лічбы"

Гаспадарча-палітычныя кампаніі, якія праводзяцца на вёсцы, вельмі слаба ўвязваюцца з задачамі калектывізацыі. Спраўдадачна-перавыбарчая кампанія сельсавецтаў у рабце праходзіла пры вялікай актыўнасьці бядняцка-серадняцкіх мас, але большасьць вясковых парт'ячэек **не скарысталі гэтай кампаніі і росту актыўнасьці бядняцка-серадняцкага сялянства для арганізацыі калгаснага прыпіву.** Перавыбары сельсавецтаў прайшлі бяз увагі з гэтай важнейшай задачай.

Зараз у раёне пачынаецца падрыхтоўчая работа **да веснавой пасеўнай кампаніі.** Відома, што гэта кампанія павінна мець рашаючае значэньне ў справе выкананьня дырэктыў ЦК КП(б)Б аб давядзеньні на працягу гэтага году калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак да 45 проц. Але тыя тэмпы і становішча гэтай работы, якія існуюць па сёньняшні дзень у раёне, не гарантуюць пасьпяховага выкананьня задач другой бальшавіцкай вясны.

ЦК КП(б)Б у дырэктыве аб падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі падкрэсьліў недапушчальнасьць зьмяншэньня лічбаў засеву ярага кліну, якія вызначаны на 1931 г. НКЗемам БССР. Але Барысаўскі райком партыі па-апартуністычнаму праламляе гэту дырэктыву. Абмеркаваўшы пытаньне аб веснавой пасеўнай кампаніі, бюро РК **прымае пастанову «прапанаваць фракцыі РВК апратэставаць перад СНК вызначэньня НКЗемам лічбы ярага кліну 36.435 гэкт. і лічыць патрэбным устанавіць плошчу яравых культур у 34 тыс. гэктараў.**

Раённае кіраўніцтва лічыць неабходным зьменшыць на 2 з паловай тыс. гэкт. плянавае заданьне пасеву яравых культур, спасылаючыся на тое, што, быццам, лічбы вызначаныя для раёнаў нерэвэльныя. На справе-ж гэта ня так. Некаторым сельсаветам даны з раёну зьменшаныя лічбы ў параўнаньні з мінулым годам. Напрыклад, у **Неманіцкім сельсавеце** ў мінулым годзе пад яравымі культурамі было занята больш 700 гэкт. а паводле сёлетняга плану РВК вызначана толькі 620. Такія зьявішчы ёсьць і ў другіх сельсаветах.

Паданыя факты нельга інакш разглядаць, як праяву правай практыкі. Штучнае зьмяншэньне насеўнай плошчы праводзілася **супроць выразных дырэктыў партыі, у адпаведнасьці з апартуністычнай** установай Барысаўскага райкому.

Практычная работа на месцах па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі не разгорнута. Не ва ўсіх калгасах складзены вытворчыя планы і абмеркаваны на сходах. Сярод сялян-аднаасобнікаў не разгорнута масавая работа на пытаньні пасеўнай кампаніі. **На рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару ніхто яшчэ не зварачае ўвагі.** Толькі 21-га студзеня высланы з раёну работнікі для арганізацыі на месцах абозаў абожжачышчальных машын. **Райпрафбюро і шэфская арганізацыя станць у баку ад пасеўнай кампаніі,** нічога яшчэ канкрэтнага не арабілі на сваёй лініі.

Такія павольныя тэмпы работы на месцах, ненаворатлівасьць кіруючых раённых устаноў у сэнсе жыцьця кіраўніцтва, праверкі і дапамогі мясцовым органам у выкананьні дырэктыў па пасеўнай кампаніі ставяць пад пагрозу ў раёне важнейшую гаспадарча-палітычную задачу другой калгаснай вясны.

Раённае парткіраўніцтва, даўшы на месцы дырэктывы аб пасеўнай кампаніі, і правёўшы на гэтым пытаньні нарады сакратароў парт'ячэек і старшынь праўленьняў калгасаў, лічыць, што гэтым мерапрыемствы выстарчаць.

Першыя зьвесткі--трывожныя

У выніку такіх безадказных адносін з боку райкому да кіраўніцтва вытворчымі парткалектывамі і ячэйкамі, што мяжуюцца з ліквідацыяй апартуністычнай практыкай, на радзе прадпрыемстваў зараз вызначаюцца прарывы. Грамфінплян на большасьці прадпрыемстваў не даведзен да рабочых у сэнсе канкрэтнага заданьня. На фабрыцы **«Чырвоная Бярэзіна»**, гуце імя Домбаля і іншых прадпрыемствах актыўнасьць рабочых ня была арганізавана для высоўваньня сустрэчнага плану. Больш таго, кіраўніцтва фабрыкі **«Чырвоная Бярэзіна» зьменшыла грамфінплян на 6 проц. у параўнаньні з асобным квартэлам і на «Пралетарскай перамозе» — на 4 проц.**

Апартуністычнае кіраўніцтва гэтых прадпрыемстваў давяло да таго, што амаль усе ўдарныя брыгады развапіліся. Больш 1000 чалавек рабочых не ахоплены сацспаборніцтвам. **Бюро партыйнага калектыву нават ня ведае, сколькі камуністаў ахоплена сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам.**

Чэрныя весткі выкананьня грамфінпляну сьпіталізуюць трывогу. За 15 дзён студзеня грамфінплян на **«Пралетарскай перамозе»** выкананы на запалках на 80 проц., на фабрыцы **«Чырвоная Бярэзіна»** на 2 проц.

Уліцыцьць УРОКІ
СПРАВЫ СЕЛЬКОРА ГАРЭЦКАГА

Тав. Гарэцкі па сваім сацыяльным становішчы зьяўляецца сынам серадняка. Пасьля прыходу з Чырвонай арміі ў 1924 годзе яго некалькі разоў выбіралі ў склад сельсавету. Ён удзельнічаў некалькі разоў, як делегат на раённых зьездах саветаў, актыўна змагаўся супроць кулацка-заможнай часткі вёскі.

На глебе сваёй актыўна-сельскораўскай дзейнасьці тав. Гарэцкі выклікаў супроць сябе злосьць з боку радаў раённых кіраўнікоў, якія праз розныя «лазейкі» прабавалі ачарніць тав. Гарэцкага. Пачалося з таго, што нейкі Парфіновіч, бацька якога ня актыўным удзеле тав. Гарэцкага раскулачан і выслан за межы Савецкае Беларусі, напісаў на тав. Гарэцкага ў «Крестьянской газете» хлусьлівую заметку, у якой тав. Гарэцкі абвінавачаўся ў сувязі з кулацтвам і ў хабарніцтве.

Гэтае абвінавачэньне адразу-ж было падхоплена ўсімі тымі элементамі, якія асабліва былі пакрыўджаны крытыкай тав. Гарэцкага. Старшыня Сьвісляцкага райвыканкому—тав. Пяроўскі, не праверыўшы сапраўднасьці высунутых супроць тав. Гарэцкага абвінавачаньняў, аддае загад аб яго зьвальненьні з пасады сакратара. Янаўскага сельсавету і адначасова сьледчымі органамі заводзіцца на яго сьледчая справа па абвінавачаньні ў сувязі з кулацтвам і ў хабарніцтве.

Пасьля дэтальнага сьледзтва сьледчы прыйшоў да высноваў, што заметка, зьмешчаная ў «Крестьянской газете», зьяўляецца рэзультатам актыўнай рабселькораўскай дзейнасьці Гарэцкага.

Здавалася-б, усё ясна. На падставе гэтых матар'ялаў трэба было аднавіць тав. Гарэцкага на рабоце. Але-ж замест аднаўленьня тав. Пяроўскі дабіваецца яшчэ зьвальненьня жонкі Гарэцкага—т. Маслоўскай з пасады настаўніцы на тых матывах, што апошняя, быццам, садзейнічала ў хабарніцтве сваёму мужу. Тав. Гарэцкі падае ў суд. Нарэшце, яму з жонкай, пасьля доўгай цяганіны, суд нарашыў выдаць кампэнсацыю за вымушаны прагул з аднаўленьнем на рабоце.

Будучы беспрацоўным і не чакаючы пастановы суда, тав. Гарэцкі ў сакавіку 1929 году паступіў на работу ў якасьці сакратара заводакіраўніцтва на гуту «Кастрычнік». Тут, як і ў сельсавеце, ён актыўна ўдзельнічае ў рабселькораўскай рабоце заводу. Адначасова пісаў у бабруйскую газэту «Камуніст» і газэту «Орка», выкрываючы рад нездаровых зьявішч на заводзе; закрануў дзейнасьць сакратара Сьвісляцкага райкому партыі—Харсонскага і інш.

Гэта зноў выклікала з боку зажмурышчыкаў самакрытыкі цкаваньне тав. Гарэцкага. Аб ім пачалі распаўсюджваць хлусьлівыя чуткі — што ён зьвязан з кулацтвам, што ён, працуючы ў Янаўскім сельсавеце, браў хабары, і дай шло да таго, што пасьля гадовай работы на заводзе Гарэцкі зноў быў зьвольнены з пасады сакратара заводакіраўніцтва гуты «Кастрычнік». У першым пратаколе пасяджэньня РКК па пытаньні аб зьвальненьні тав. Гарэцкага зафіксавана наступнае: «заводакіраўніцтву ня было вядома яго находжаньне і за што ён быў зьвольнен х Янаўскага сельсавету, дзе яго абвінавачалі ў растрачэ і хабарніцтве. Ня гледзячы на тое, што ў яго маюцца дакумэнты аб спыненьні судом справы з прычыны адсутнасьці абвінаваўчых матар'ялаў, лічыць, неабходным у інтарэсах вытворчасьці яго зьвольніць». З гэтай фармулёўкай органы Наркамправы, бязумоўна, не маглі згадзіцца і таму было патрэбна новае пасяджэньне РКК, на якім прымаецца пастанова, да якой вельмі цяжка прычапіцца, а іменна: «Вельмі часта ня выконваў вусных распараджэньняў заводакіраўніцтва і груба адносіўся да рабочых».

Каб выключыць Гарэцкага з рабселькораўскіх радоў, бюро парткалектыву гуты «Кастрычнік» уводзіць у эмэн газэты «Камуніст» і «Орка» і партыйныя органы. Паказаныя газэты, не праверыўшы гэтых матар'ялаў, но разгледзеўшы ўсёй гэтай справы і не запытаўшы нават тлумачэньня ад самога тав. Гарэцкага, «з месца ў карэр», «выкрылі» яго і тымі ж чынілі з рабселькораўскіх радоў, як чужы элемэнт.

Райком партыі ў асобе тав. Харсонскага стаў на чале зажмурышчыкаў самакрытыкі і сумесна з імі дабіўся зваленьня Гарэцкага з пасады і выключэньня яго з радоў рабселькораў.

Рэдакцыі газэт «Орка» і «Камуніст» ня прыналі сваёй віны, не адмавілі тав. Гарэцкага ў радах рабселькораў і не дапусьцілі свайго голасу да цэнтральнага органу КП(б)Б — «Зьвязды».

Толькі ўмяшальнасьць прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б канчаткова паклала канец гэтай агідзе, на сваім зьмесьце, справе. Тав. Гарэцкі адноўлен у радах рабселькораў, пішаваты прыцягнуты да партыйнай адказнасьці і будуць прыцягнуты да судовай адказнасьці. Але на гэтым спыніцца нельга. Партыйным арганізацыям на месцах, рэдакцыям газэт, асабліва газэтам «Орка» і «Камуніст», трэба будзе ўлічыць урокі справы тав. Гарэцкага з тым, каб такія справы больш не паўтараліся ў нашай штодзённай рабоце на разгортваньні самакрытыкі.

С. Шок.

У ролі глушыцеля самакрытыкі і пралетарскай ініцыятывы

Наступ самакрытыка ў Барысаўскай арганізацыі ня ўзьнята на тую вышыню, на якой яна павінна быць, як важнейшая зброя для зьнішчэньня недахопаў у рабоце і змаганьня са скажэньнямі палітыкі партыі. Кіраўніцтва большасьці ўстаноў і прадпрыемстваў не рэагуе на зьмешчаныя ў друку рабселькораўскія заметкі і допісы, прысланыя на расьсьледваньне з рэдакцый газэт. Такія адносіны вельмі кепска, зусім натуральна, адбіваюцца на рабселькораўскім руху ў раёне.

Зажымшчыкі самакрытыкі прыцягваліся да адказнасьці ў судовым парадку, але па партыйнай лініі нічога ня было зроблена для мабілізацыі грамадзкай думкі вакол гэтых спраў і разгортваньня пралетарскай самакрытыкі. Больш таго, кіраўніцтва раённай парт-арганізацыяй за апошні час стала на шлях **заціску самакрытыкі,** якая была накіравана на барацьбу супроць апартуністычнай практыкі праўленьня Барысаўскага ЦРК.

Кіраўніцтва ЦРК праявіла поўную нядзельнасьць выконваць дырэктывы партыі аб палепшэньні рабочага забесьпячэньня шляхам арганізацыі закрытых разьмеркавальнікаў. За шыльдамі закрытых разьмеркавальнікаў творацца адкрытыя злачынствы асобнымі кааперацыйнымі работнікамі. Нам, старшыні праўленьня ЦРК Бабіцкі адкрыта прапагандуе права-апартуністычныя погляды аб сыстэме закрытых разьмеркавальнікаў, заяўляючы, што закрытыя разьмеркавальнікі нічога не дадуць для палепшэньня рабочага забесьпячэньня.

Змазванае пытаньняў аб злачынствах, выжываньне з кааперацыйнай работы вылучэньцаў, заціск самакрытыкі — усё гэта мае месца ў рабоце ЦРК. На такое становішча райком партыі не зьвярнуў увагі і абмяжоўваўся толькі зьменам сакратароў парткалектыву ЦРК, пакідаючы на кіруючых пасадах у праўленьні ЦРК апартуністаў. А калі выказала рэдакцыя газэты «Кооперативная Жизнь» арганізавала ў Барысаве «дэкаду дапамогі кааперацыі» (згадзіўшы гэта пытаньне з культпропам РК, праўленьнем і парткалектывам ЦРК), уцякла рабочую грамадзкасьць для палепшэньня работы ў ЦРК, мабілізавала праз рабкораўскія брыгады матар'ялы для газэты, сакратар РК Сасноўскі спаў, выкарыстоўваючы сваю ўладу для зрыву гэтага важнейшага мерапрыемства: **ён распарадзіўся канфіскаваць першы нумар газэты «К. Ж.», ня даўшы ні аднаго станоўчага матыву свайму па меншай меры галавацяпскаму ўчынку.**

Чым-жа выклікана была гэта канфіскацыя арганізаванай вылазкай рэдакцыяй газэты, калі выпуск гэтай газэты быў узгоднен з адпаведнымі органамі, з тым ліку і культпропам райкому?

Аказваецца, Сасноўскі параўнаў страхаваць апартуністычнае кіраўніцтва ЦРК ад крытыкі рабочых мас праз друк. Гэтага вельмі дамагаецца старшыня праўленьня ЦРК Далінскі (член бюро РК). **Абарона гонару мундзіра і кругавая парука ўзялі верх над агульнапартыйнымі задачамі палепшэньня работы кааперацыі і выкарыстоўваньня з ле апартуністычных элементаў. Сасноўскі** сваім учынкам пастаўлены сабе ў рады плушыцелаў самакрытыкі і ініцыятывы мас.

Вось і ўсё, што маглі сказаць дзяцьцы Барысаўскага гарсавету аб нацыянальнай палітыцы. Райком партыі не палічыў патрэбным выпразьніць гэтай палітычнай памылкі гарсавету. Затое, у сенсе канспірацыі гэтай справаздачы ад друку РК правіў вялікае стараньне. Сакратар РК **Сасноўскі,** даведаўшыся, што работнікам раённай газэты ўзята справаздача для пачці ёй ацэнкі праз газэту, запрапанаваў яму здаць пасьлядна справаздачу ў райком і на **сядзяньні бюро РК дамагаўся прыцягненьня гэтага таварыша да партыйнай адказнасьці (!!)**

Старшыня конкурснай камісіі—тав. **Каменштэйн,** падводзячы вынікі дакладам і спрэчкам, указаў, што асноўнымі прэтэндэнтамі на сьцяг зьяўляюцца 6 прадпрыемстваў: **«БАЛЬШАВІК», «КАМУНАР», «ЭНЭРГІЯ», «ПАЛЕСДРУК» і «КАСТРЫЧНІК».** Конкурсная камісія павінна будзе з гэтых лепшых прадпрыемстваў вызначыць трох самых лепшых і ім перадаць пераходныя сьцягі.

Але на гэтым конкурс ня павінен скончыцца. Ня трэба забываць,—кажа тав. **Каменштэйн,**—што сьцягі—пераходныя і што ў 1931 годзе будзе не адзін **ударны квартал, а чатыры. Фабрыкі і заводы БССР павінны выкарыстаць вопыт лепшых прадпрыемстваў і дабіваецца яшчэ лепшых вынікаў у выкананьні сустрэчных грамфінпляноў, рашаючага году пяцігодкі.**

Д.

Брыгада «Зьвязды»: Я. ІВАШЫН, С. БРАЙНІН, Н. НЭЙДЛІН.

ПАПРАЎКА.

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» на трэцяй старонцы перабіты подпісы да фота-здымкаў ударнікаў. Першым зьверху ідзе ... транспарту—тав. МАКАРЭВІЧ, ... праваднік вагону чык менскага дэпо.

Хто атрымае сьцяг?

ЛЕПШЫЯ З ЛЕПШЫХ

ГЭТЫМІ ДНЯМІ КОНКУРСНАЯ КАМІСІЯ ВЫРАШЫЦЬ--ЯКІЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ АТРЫМАЮЦЬ ПЕРАХОДНЫЯ СЬЦЯГІ ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ І ЦК ЛКСМБ

Сярод кандыдатаў—„Пралетары", „Бальшавік", „Камунар", „Энэргія", „Палесдрук" і „Кастрычнік"

Заўчора конкурсная камісія пры ЦСПСБ заслухала даклады яшчэ чатырох лепшых прадпрыемстваў—кандыдатаў на пераходныя сьцягі на ўсесаюзным конкурсе.

***

Тав. **Шупькін** паведаміў камісіі як справіўся са сваімі задачамі завод **«Камунар».** Прамфінплян другога году пяцігодкі завод перавыканаў па ўсіх паказальніках. Праграма ўдарнага кварталу, дзякуючы сустрэчнаму прамфінпляну, была павялічана ў параўнаньні з праграмай першага кварталу 1929-30 году на 227 проц. і ў параўнаньні з апошнім кварталам другога году—на 151,6 проц. Павялічаны прамфінплян-ударнага кварталу таксама быў перавыкананы **па ўсіх паказальніках** пры адначасовым зьмяншэньні запраектаванай колькасьці рабочай сілы на 0,8 проц.

Посьпехі заводу зьявіліся ў выніку бязьлітаснай барацьбы за генэральную лінію партыі і рашучага адпору апартуністычным элементам на заводзе (у кавальскім і ліцейным цэхах), шырокага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, а таксама перабудовы партыйнай, прафсаюзнай і гаспадарчай работы на **аснове пастановы XVI партзьезду.**

Колькасьць ударнікаў са асобны квартал павялічылася больш, як у два разы, і складае 97,1 проц. усяго ліку рабочых. Колькасьць ударных і «сквозных» брыгад, вытворчых калектываў павялічылася ў два разы, колькасьць вытворчых камун—у 5 раз. Члены партыі і камсамолу ахоплены сацспаборніцтвам на ўсе 100%. Колькасьць замацаваных да канца пяцігодкі складае 94,6 проц. Арганізаваны 2 камуністычных пэхі.

Прамфінплян ударнага кварталу даведзен да кожнага варштату і рабочага. Праверка выкананьня і прамфінпляну праводзілася пэрыядычна—кожную дэкаду.

Мала рэалізавана рабочых прапаноў: з 354 прапаноў выканана толькі 62; 40 з іх далі эканомію 55 тыс. рублёў. Сустрэчны плян рацыяналізацыі на 1931 год налічвае 157 прапаноў з арыентыровачнай эканоміяй **у 250 тыс. рублёў** супроць 200 тыс. рублёў, запраектаваных мяталяб'яднаньнем.

Падпіска на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» дала **164 проц. заданьня.** Прагулы зьменшыліся да 0,18 проц. замест 0,2 проц., паводле плану і 0,22 проц.—у чацьвертым квартале 1929-30 году.

Значныя дасягненьні мае завод у справе шэфства над вёскай. Праведзена пераклічка рабочых з калгасьнікамі аб выкананьні сацдагавору, у падшэфным калгасе арганізавана пажарная дружына, шэфны гурток. Рабочыя «Камунара» дапамаглі калгасу выпрацаваць сустрэчны прамфінплян, далі калгасу ударныя брыгады ў дапамогу ўборцы ўраджаю. **Брыгады «Камунара» дапамаглі арганізаваць у падшэфным сельсавеце яшчэ адзін калгас у 16 двароў.**

Сустрэчны прамфінплян на 1931 год прадугледжвае рост прадукцыі на трох асноўных цэхах на 17-20 проц. Праграмоўка сустрэчнага прамфінпляну праходзіла ў нарадах сацыялістычнага спаборніцтва паміж цэхамі. У выніку рабочыя сьпісарнага і такарнага цэхаў добраахвотна зьнялі расцэнкі на 10 апэрацыях на 8-30 проц.

З недахопаў дакладчык адзначыў недыстрахальную ўвагу калектыву да якасьці прадукцыі, слабыя тэмпы рэалізацыі рабочых прапаноў, на досыць выразную перабудову работы вытворчых нарад і шмат недахопаў у галіне аховы працы.

***

Наступны даклад зрабіў тав. **Хаськін**—д. завода **«Энэргія».** І завод «Энэргія» мае за ўдарны квартал шмат дасягненьняў. Перавыкананьне прамфінпляну на ўсіх паказальніках, падвойны рост ўдарніцтва, узмацненьне сацспаборніцтва, значная колькасьць рабочых прапаноў, якія далуць эканомію (арыентовачна) 149 тыс. рублёў, 917 чал. з 1222 самазамацаваліся на заводзе да канца пяцігодкі. Добраахвотнае зьнижэньне расцэнак—у сярэднім на 10 проц.—прынесла эканоміі каля 5 тыс. руб.

Перабудова работы ў цэхах выявіла шмат нядобрасак у рабоце цэхаў і зьмен, у іх абслугоўваньні. Рабочыя, пад кіраўніцтвам парткалектыву, выкінулі з сваіх радоў апартуністаў, якія тармазілі выкананьне прамфінпляну.

***

Аб рабоце шэфнай фабрыкі **«Кастрычнік»** даклад зрабіў **тав. Зархін.** За апошнія паўтара года фабрыка з амаль саматужнай ператварылася ў перадавую мэханізаваную фабрыку, дзе працэсы работы пабудаваны па сэкцыйнай разьмеркавана на 130 працэсаў. Аб росьце фабрыкі сьведчаць наступныя лічбы: праграма фабрыкі ў 1927-28 годзе—**18 млн. рублёў,** у 1929-30 праектавана **28 млн. рублёў.**

Прамфінплян другога году пяцігодкі выканан па ўсіх паказальніках. Праграма ўдарнага кварталу выканана на 103,7 проц. Затое заданьне па зьніжэньні сабекошту выканана ўсяго на 1,9 проц. замест 9 проц., паводле плану. Невыкананьне гэтага асноўнага якаснага заданьня зьяўляецца буйнейшым недахопам у рабоце фабрыкі. Адтак, у іншых галінах фабрыка дабілася многіх дасягненьняў. На фабрыцы перабудавана партыйная, прафсаюзная і вытворчая работа. 817 рабочых самазамацаваліся на фабрыцы да канца пяцігодкі. План рацыяналізацыі на 1931 год навінен даць эканомію ў 651 тыс. руб. Ударныя брыгады на палстаме росту прадукцыйнасьці працы пераглядзелі расцэнкі і зьнізілі іх на 10 проц. 39 рабочых падалі заявы аб уступленьні ў партыю і г. д.

*

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПОСЬПЕХ БУДАЎНІЦТВА НОВЫХ МТС

ДАГАВОРНУЮ КАМПАНІЮ СКАРЫСТАЕМ ДЛЯ ДАЛЕЙШАГА РОСТУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Руйнуючы ўдар па кулаку, які прабуе перашкодзіць будаўніцтву апорных пунктаў суцэльнай калектывізацыі

Саўгас «Тарасава» і па-бальшавіцку выхтуюцца да веснавой сяўбы. Саўгас скончыў чыстку насення і адправіў свае трыеры ў калгасы і вёскі для дапамогі калгаснікам і адніваасобнікам бяднякам і сераднякам. На здымку трактарысты складаюць адраманцаваны трактар.

МЕНСК, 26 СТУДЗЕНЯ

З вясны гэтага году на палёх Савецкай Беларусі пачнуць працаваць звыш 20-ці новых буйных машына-трактарных станцый. Звыш 1.000 сталёвых коняй павінны будуць абрабіць каля 400 тысяч гэктараў калгаснай зямлі. МТС зробяць сапраўдную рэвалюцыю на палёх БССР.

Узброіваючы бядняцка-серадняцкія масы вёскі навейшай машыннай тэхнікай, машына-трактарныя станцыі адначасова ўзімаюць іх актыўнасць на выкананьне важнейшай задачы партыі сацыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Машына-трактарныя станцыі падрываюць карэньні капіталістычных адносін у вёсцы.

Факты гавораць аб тым, што ў радзе раёнаў БССР мясцовыя работнікі зусім недаацэньваюць значэньня МТС у справе сацыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Дагаворы ў раёнах мерудзяць з вызначэньнем вытваркаў і нават памяшканьняў для МТС.

— Калі вам патрэбна памяшканьне, будуйце яго самі, — вось прыблизны адказ, які далі работнікі **Клімавіцкага** гарсавету на просьбу вызначыць памяшканьне для МТС. У Капыльскім раёне **для МТС** адвялі зусім непригоднае памяшканьне, сьцены якога ўжо пакрывіліся і аселі.

Аспэўнае значэньне машына-трактарных станцый заключаецца ў тым, што яны зьяўляюцца **магутнымі вагарамі калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі.** Шляхам сацыялістычных дагавораў з наўколышнімі калгасамі і бядняцка-серадняцкімі масамі вёскі, МТС у раёне сваёй дзейнасьці (радыусам 16-20 кілёмэтраў) **дабіваюцца калектывізацыі суцэльных масываў.**

Здавалася-б, што раённыя арганізацыі, улічваючы ўсё гэта, павінны былі-б актыўна дапамагчы МТС пры заключэньні імі дагавораў з калгаснымі і бядняцка-серадняцкімі масамі. Між тым, некаторыя раённыя работнікі з першых-жа дзён арганізацыі МТС замест дапамогі правялі апартуністычныя адносіны да такой важнай палітычнай справы.

Так, замест дапамогі МТС, папулярызацыі яе дзейнасьці і тым самым актыўнай садзейнасьці разгортванню далейшай калектывізацыі, работнікі **СІРОЦІНСКАГА** раёну прапануюць МТС заключаць дагаворы толькі з існуючымі калгасамі. Гэта значыць, што сіроцінскія апартуністы з першага дня арганізацыі МТС хочуць іх абарнуць толькі ў рэактыўныя пункты, што зусім ня мае нічога агульнага з тымі задачамі, якія пастаўлены перад МТС партыяй.

Гэтыя факты можна расцэньваць толькі як праяўленьне правага апартунізму на практыцы. Адмаўленьне ад арганізацыі дагаворнай кампаніі паміж МТС і калгасамі ёсьць па сутнасьці адмаўленьне ад далейшага разгортваньня калектывізацыі.

Кулацтва адчувае, што МТС наносяць яму руйнуючы ўдар. Кулацтва ўсімі мерамі змагаецца з будаўніцтвам машына-трактарных станцый. Кулакі распускаюць усякія хлусьлівыя байкі пра МТС, усякімі сродкамі імкнуцца даказаць беднякам і сераднякам, што «абрабляць зямлю трактарам нявыгадна» і г. д.

Разгортваньне масавай растлумачальнай кампаніі вакол МТС і заключэньне дагавораў паміж МТС і бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства павінна зараз стаць баявой задачай раённых арганізацый. На базе МТС трэба зараз-жа разгарнуць арганізацыю новага магутнага калгаснага прыліву і баявую падрыхтоўку да другой калгаснай вясны. Масавай работай трэба зараз-жа параліжаваць кулацкую агітацыю супроць МТС, супроць калектывізацыі, нанесьці руйнуючы ўдар па кулаку.

Трэба рашуча выкрываць правых апартуністаў, якія ня хочуць разумець значэньня МТС у справе сацыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

Адначасова трэба бязьлітасна змагацца з усякімі рэцыдывамі «левых» загібаў, з усякімі спробамі парушэньня прынцыпу добраахвотнасьці пры арганізацыі калгасаў.

Праз пасьпяховую арганізацыю МТС мы можам сапраўды забясьпечыць выкананьне пастаноў кастрычніцкага пленуму ЦК УсесКП(б) аб калектывізацыі ў 1931 г. 45 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак Савецкай Беларусі.

Пракатныя пункты,

АПОРНЫЯ ПУНКТЫ СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Апартуністы Сіроцінскага раёну зрываюць арганізацыю МТС

Будаўніцтва машына - трактарных станцый уносіць поўную рэвалюцыю ў сельскую гаспадарку. Шлях МТС — пераўтварэньне аднаасобных гаспадарак у калектыўныя, гэтым самым вынішчэньне межаў, цераспалосіцы.

Канчатковая мэта МТС — правядзеньне суцэльнай калектывізацыі на базе механічнай апрацоўкі палёў.

Пачатае ў БССР будаўніцтва машына - трактарных станцый сустрэла на сваім шляху рад перашкод, выклікала шалёнае супраціўленьне клясавага ворага. Будаўніцтва і арганізацыя МТС праходзяць у абстаноўцы абостранага клясавага змаганьня.

Каб забясьпечыць посьпех работы МТС і правядзеньне імі другой бальшавіцкай вясны, зараз павінна быць шырока разгорнута дагаворная кампанія паміж машына - трактарнымі станцыямі і калгасамі. Ад посьпеху правядзеньня гэтай кампаніі будзе залежаць далейшая работа МТС.

Весткі з раду раёнаў гавораць аб тым, што дагаворы масавай, растлумачальнай работы вакол МТС, якая была-б накіравана на арганізацыю калгаснага прыліву, не праводзіцца. Дагаворы заключаны зусім нязначная колькасьць дагавораў паміж МТС і калгасамі.

Аспэўнай прычынай гэтага зьяўляецца тое, што раённыя арганізацыі недаацэньваюць значэньня МТС, не дапамагаюць ім, а часамі нават перашкаджаюць разгортваньню іх работы.

Яркім прыкладам апартуністычнай недаацэнкі значэньня МТС зьяўляецца Сіроцінскі раён. Адзін з адказных работнікаў раёну **(т. ВАЛОДЗЬКА)** замест дапамогі МТС, арганізацыі на іх базе повага калгаснага прыліву, дае дырэктыву аб тым, каб МТС заключалі дагаворы толькі з існуючымі калгасамі, прычым т. Валодзька рэкамандуе заключаць дагаворы з калгасамі ня ў радыусе дзейнасьці МТС, а на ўсім адміністрацыйным раёне.

«Калі заключаць дагаворы з усімі калгасамі адміністрацыйнага раёну, дык для МТС работы хопіць, і ня трэба зусім дабівацца арганізацыі новых калгасаў», — заўважыў другі работнік Сіроцінскага раёну — тав. **САКАЛОЎ.**

Апартуністычныя заявы сіроцінскіх кіраўнікоў не разыходзяцца са справай. Сіроцінскі раён дагаворы ня выдаўчыў ні аднаго адказнага партыйнага работніка для прагандзеньня дагаворнай кампаніі паміж машына - трактарнымі станцыямі і калгаснымі бядняцка - серадняцкімі масамі вёскі.

Нічога ня робіцца ў раёне і ў галіне далейшага разгортваньня калектывізацыі. Процант калектывізаваных гаспадарак, ня гледзячы на наяўнасьць калгаснага ўзьдыму бядняцка-серадняцкіх мас, у выніку апартуністычнай бязьдзейнасьці раённых арганізацый рясьце вельмі павольна. Калгасы, якія за апошні час узьнікі ў раёне (імя Варашылава, «Краіна Саветаў» і інш.), арганізаваліся стыхійна.

«Дагавор табальны для калгасаў, расцэнкі работы надта высокія, апрацоўваць зямлю трактарам нявыгодна, трактар гною ня дасьць», — вось як агітуюць кулакі сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, каб не дапусьціць разгортваньня будаўніцтва МТС.

Многія раённыя работнікі замест рашучай барацьбы з такой агітацыяй самі заражаюцца кулацкімі настроямі. Так, сіроцінскія раённыя работнікі на працягу цэлага месяца вайдаюцца дыскусіяй аб тым, як перарабіць тыповы дагавор і «прыстасаваць» яго да мясцовых умоў.

Тут мы маем замаскаваную спробу праных апартуністаў **спустошыць арганізуючую ролю МТС у справе сацыялістычнай рэконструкцыі вёскі,** мы маем спробу зьвесьці МТС да пракатных пунктаў, прымусіць іх пайсьці па распыленьне трактарнага парку, што ў выніку можа прывесьці толькі да дыскрэдытацыі МТС сярод бядняцка-серадняцкіх мас.

Многія раённыя работнікі, як і дырэктары МТС, ніяк ня хочуць усьвядоміць, што пасьпяховае будаўніцтва МТС немагчыма без рашучага наступленьня на кулака, без разгортваньня работы на арганізацыі калгаснага прыліву.

У выніку апартуністычнай недаацэнкі значэньня МТС і бязьдзейнасьці раённых арганізацый заключэньне дагавораў паміж МТС і бядняцка-серадняцкімі масамі вёскі ў радзе раёнаў знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Раённыя арганізацыі павінны зараз-жа рашуча павярнуцца тварам да МТС і пачаць прапушчаны час. Трэба шырока разгарнуць растлумачальную кампанію сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі. Выявіць усе перашкоды на шляху будаўніцтва МТС, актыўна дапамагчы ім правесьці дагаворную кампанію з калгасамі, рашуча змагацца з усякімі праяўленьнямі правага апартунізму ў будаўніцтве МТС!

Маскаленка.

Арганізацыяй новых калгасаў

АДЗНАЧЫЛІ ГАДАВІНУ СЬМЕРЦІ ІЛЬЛІЧА

З РОЗНЫХ РАЁНАЎ БССР ПАСТУПАЮЦЬ ВЕСТКІ АБ НОВЫМ МАСАВЫМ КАЛГАСНЫМ ПРЫЛІВЕ, ЯКІМ БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІЯ МАСЫ СЯЛЯНСТВА АДЗНАЧЫЛІ ЛЕНІНСКІЯ ДНІ.

ВЁСКА **СЛАВУТЫ,** МАЛЯЦЬКІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, КРЫЧАЎСКАГА РАЁНУ, У СУВЯЗІ З ЛЕНІНСКІМІ ДНЯМІ, ПОЎНАСЬЦЮ ЎВАЙШЛА Ў НОВААРГАНІЗАВАНЫ КАЛГАС ІМЯ СТАЛІНА.

У ВЁСЦЫ ДАРЛІВАЯ, КАСЬЦЮШКОЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ АРГАНІЗАВАНЫ КАЛГАС З 19-ЦІ ГАСПАДАРАК. У ВЁСЦЫ БАЕЎКА АРГАНІЗАВАНЫ 2 КАЛГАСЫ Ў ЛІКУ 26 ГАСПАДАРАК. ЗНАЧНЫ ПРЫЛІЎ ЁСЬЦЬ У КАЛГАСЕ «ІСКРА», КАРШАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ. АРГАНІЗАВАЎСЯ КАЛГАС ІМЯ ГАЗЭТЫ «САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ШЛЯХ» У СКЛАДЗЕ 20 БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

У БЯГОМЛЬСКІМ РАЁНЕ Ў КАЛГАСЫ ЎЛІЛОСЯ 505 ГАСПАДАРАК.

У ГАРАДОЦКІМ РАЁНЕ Ў ЛЕНІНСКІЯ ДНІ АРГАНІЗАВАНЫ КАЛГАСЫ **ІМЯ ІЛЬЛІЧА, МОЛАТАВА, «ТКАЧЫ», «ІСКРА» І «РЫБАК».**

У ХАЛОПЕНІЦКІМ РАЁНЕ Ў ДЗЕНЬ СЬМЕРЦІ ЛЕНІНА ПРАВЕДЗЕНЫ СХОДЫ КАЛГАСЬНІКАЎ, БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ, НА ЯКІХ ПАСТАЎЛЕНЫ ДАКЛАДЫ АБ ЛЕНІНЕ. У ВЁСКАХ РАЁНУ СТВОРАНЫ ДВА НОВЫЯ КАЛГАСЫ. У РАДЗЕ КАЛГАСАЎ АРГАНІЗАВАНЫ ЎДАРНЫЯ БРЫГАДЫ ІМЯ ЛЕНІНА ПА ВЫКАНАНЬНІ ГАСПАДАРЧЫХ ЗАДАЧ.

ВСНГ і Белкаапсаюз

ігнаруюць важнейшую кампанію

Рамонтная кампанія праходзіць у БССР нездавальняюча. Беларускі камітэт саюзу мэталістаў у свой час зьвярнуўся з заклікам да мэталяапрацоўчых заводаў неадкладна ўключыцца ў падрыхтоўку да другой калгаснай вясны і бальшавіцкімі тэмпамі правесьці рамонт трактараў і с.-г. машын.

Учора пры саюзе мэталістаў была склікана нарада на пытаньні аб падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі і ходзе рамонту с.-г. інвэнтару. Але нарада была сарвана з прычыны няўкі прадстаўнікоў **ВСНГ, Белкаапсаюзу, МЦРК** і дырэктароў і старшынь заўкомаў заводаў **«Камунар», «Энергія»** і **«Полымя рэвалюцыі».**

Прэзыдыум камітэту саюзу мэталістаў абвясьціў старшыням паказаных заўкомаў вымову за яўную апартуністычныя адносіны да пасеўнай кампаніі.

Адначасова ставіцца пытаньне перад ЦК партыі аб недапушчальных адносінах некаторых арганізацый, у прыватнасьці ВСНГ, Белкаапсаюзу да пытаньняў падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі.

Наступная нарада склікаецца ў саюзе мэталістаў 27 студзеня ў 2 гадзіны дня.

Заслаўская МТС арганізавала 3-хмесячныя курсы па падрыхтоўцы трактарыстаў-рулявых. Да веснавой сяўбы курсы выпусьцяць 25 трактарыстаў.

Калгасьніцы с.-г. арцелі «Кастрычніцкая рэвалюцыя», Заслаўскага раёну падпісваюць дагавор з МТС.

Кантрактацыя—

важнейшы вучастак веснавой сяўбы

Скарыстаць кантрактацыю як сродак сацыялістычнай перабудовы вёскі

(Гутарка з нам. нар. камісара гандлю т. Абрамсонам)

Пасьпяховы ход сацыялістычнага будаўніцтва, перавыкананьне заданьняў пяцігадовага пляну па важнейшых галінах народнай гаспадаркі дае магчымасьць ураду Савецкага Саюзу дабіцца больш шпаркіх тэмпаў сацыялістычнай рэконструкцыі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі як па лініі прамысловасьці, так і сельскае гаспадаркі.

Шпаркія тэмпы індустрыялізацыі краіны даюць поўную магчымасьць у веснавую пасеўную кампанію 1931 г. укласьці значна большыя сродкі ў сельскую гаспадарку, узмацніць дапамогу дзяржавы справе калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх мас, вёскі.

Кантрактацыя—адна з форм, пры дапамозе якой будзе больш пасьпяхова адбывацца рост сельскай гаспадаркі па новых сацыялістычных пачатках.

Кантрактацыя ва ўмовах БССР будзе накіравана, галоўным чынам, на ахоп таварнай часьці тэхнічных культур—ільну, канапель і павялічэньня таварнасьці бульбы.

Кантрактацыя—непасрэдна зьвязана з правядзеньнем другой бальшавіцкай вясны.

Пляны кантрактацыі праводзяцца адначасова з прыняцьцем пасеўных плянаў другой бальшавіцкай вясны па індывідуальным сэктары і вытворчых плянаў у калгасах.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на скарыстаньне кантрактацыі, як аднаго з важнейшых вагароў на ўзмацненьні тэмпаў калектывізацыі, на ўцягненьні новых сотень гаспадарак у калгасы.

Дагавор па кантрактацыі зьмяняецца двухбаковым абавязацельствам, паводле якога з аднаго боку калгасы, саўгасы і індывідуальныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі абавязаны заключаць кантрактаваць як мага большую плошчу пасеваў, дабіцца правядзеньня аграмінімуму і слачы добраякаснага прадукту.

З другога боку дзяржава бярэ на сябе абавязацельства забясьпечыць гэтыя гаспадаркі машынамі, угнаеньнем, аградапамогай, наленьнем, забясьпячэньне праматаварамі.

Пры правядзеньні кампаніі кантрактацыі ў мінулыя гады былі дапушчаны грубейшыя памылкі.

Мы мелі такія факты, калі кантрактацыя праводзілася адміністрацыйным парадкам. Пляны кантрактацыі не абгаварваліся на шырокіх сходах калгаснікаў і бядняцка-серадняцкай часткі вёскі. Гэта прывяло да таго, што ў некаторых мясцох пляны кантрактацыі ня былі выкананы.

Гэтыя факты павінны ўлічыць партыйныя, камсамольскія і кіруючыя калгасныя і саўгасныя арганізацыі, каб упікнуць такіх памылак пры правядзеньні кантрактацыі ў 1931 г.

Калгасы павінны быць асноўным змагарамі за гэту справу, агітатарамі за бальшавіцкае правядзеньне пляну кантрактацыі.

Выканаць заданьне па вытворчым каапэраваньні бядняцка-серадняцкіх гаспадарак

За першы квартал каапэраваць ня менш 70 проц. гаспадарак

ЭКАНА БССР заслухала даклад НКЗ аб выкананьні пляну вытворчага каапэраваньня бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, ЭКАНА канстатавала, што ў выніку апартуністычнай недаацэнкі каапэрацыйнымі сыстэмамі, зямельнымі органамі і значнай часткай РВК значэньня і ролі вытворчага каапэраваньня ў справе сацыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, ПЛЯН ВЫТВОРЧАГА КААПЭРАВАНЬНЯ САРВАНЫ: КААПЭРАВАНА ПА ЛІНІІ МАЛОЧНАЙ СЫСТЭМЫ ТОЛЬКІ 22,8 ПРОЦ. ПЛЯНУ, ІЛЬНАКАНАПЛЯВОДЧАЙ — 20 ПРОЦ., САДОВА-ГАРОДНЯЙ—15 ПРОЦ.

Да гэтага часу няма дакладнага ўліку існуючых вытворчых таварыстваў. Работа па арганізацыі новых таварыстваў не разгорнута.

Паводле пляну да 1 студзеня г. г. павінна было быць каапэравана 65 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Аднак, большасьць раёнаў БССР ня выканала пляну. У сувязі з гэтым ЭКАНА вызначыла апошні тэрмін выкананьня заданьня — 1 ліпеня 1931 году, абавязаўшы каапэрацыйную сыстэму і Наркамзам БССР распрацаваць каляндарны план правядзеньня каапэраваньня з такім разьлікам, каб ужо ў першым квартале бягучага году вытворчай каапэрацыяй было ахоплена ня менш 70 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Райвыканкомам даручана ў дакладны тэрмін правяраць становішча каапэраваньня ў раёнах і распрацаваць канкрэтныя пляны гэтай работы.

За недапушчальна дрэнная правядзеньне вытворчага каапэраваньня ЭКАНА АБВЯСЬЦІЛА ВЫМОВУ ПРЭЗЫДЫУМУ АСЬВЕЙСКАГА РАЙВЫКАНКОМУ.

Падкулачнік

падрывае работу Ветрынскай МТС

У мінулым годзе ў **Ветрынскім** раёне была арганізавана трактарная калёна ў складзе 12-ці трактароў. Трактарная калёна выканала заданьні на ўзорванні на 100 проц. і сваёй работай заваявала аўтарытэт сярод калгаснікаў і адніваасобнікаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну.

У перасьні ў раёне арганізавалася машына-трактарная станцыя, куды ўлілася ўся трактарная калёна.

На новую МТС Трактарацэнтр накіраваў старшым механікам А. Сідарэйка. Апошні замест таго, каб паставіць работу МТС на належную вышыню, заняўся бруднымі справамі, склокамі, хуліганствам, п'янкай і г. д. Ён выжыў з МТС лепшых работнікаў.

Атрымаўшы хабар, Сідарэйка прыняў на работу ў якасьці цесьляра кулака **Патрэбну** і ў той-жа час адмовіў у рабоце калгасьніку-бедняку. У час адсутнасьці дырэктара МТС у лістападзе Сідарэйка на працягу 2-х тыдняў выкарыстоўваў цесьляра для сваіх асабістых патрэб. У сьнежні Сідарэйка паехаў у Адэсу, пакупляў сабе пшанічнай мукі і іншых прадуктаў і перасылаў гэта над відам трактарных часьцей для Ветрынскай МТС.

20 сьнежня Сідарэйка разам з пазначаным ім на пасаду механіка, сваяком Гардзеенка, напіліся і потым прабавалі зьбіць камсамольца-калгасьніка Сіпякоўскага. Сідарэйка са сваёй кампаніяй часта ў п'яным відзе зьяўляецца ў калгасы і патрабуе малака і коняй для паездак на невядомых справах.

Зусім зразумела, што пры такім «кіраўніцтве» з боку старшага механіка плян рамонту трактароў зрываецца. Да гэтага часу адрамантавана ўсяго толькі 4 трактары і ні аднаго пакуль, у той час, як да 1 сакавіка павінен быць скончан рамонт 21 трактару і 30 плугоў.

Рабочыя Ветрынскай МТС патрабуюць ад РСІ і пракуратуры бязадкладнага зьняцьця Сідарэйка і яго прыняцеляў а работы і прыцягненьня да адказнасьці за крымінальныя справы і падрыў работы МТС.

Трактарацэнтр і саюз с.-г. рабочых павінны бязадкладна ўмяшацца ў гэту справу і аздаровіць работу на машына-трактарнай станцыі.

Анатоль Кудзелька.

Нарада дырэктароў і старшых аграномаў МТС

25 студзеня, вечарам, у памяшканьні Цэнтральнага Дому селяніна адкрылася пашыраная ўсебеларуская нарада дырэктароў і старшых аграномаў МТС, скліканая Беларускім Аддзяленьнем Трактарацэнтру і рэдакцыяй газ. «Бел. Вёска».

На нарадзе з дакладам аб падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай сяўбы і задачах МТС выступіў тав. Рачыцкі.

На нарадзе выступаюць прадстаўнікі з месц з інфармацыяй аб становішчы МТС і падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай сяўбы.

Тварам да МТС!

Аб ролі МТС як сапраўдных будаўнікоў новай вёскі, лепшых агітатараў за калгасы, гавораць першыя вынікі дзейнасьці **Койданаўскай, Асьвейскай і іншых МТС. За адну толькі восень у раёне дзейнасьці Койданаўскай МТС арганізавана 20 новых калгасаў, у якія ўвайшло 540 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Танежыцкая МТС у часе зяблевай заворбавала ў калгасы каля 100 гаспадарак.**

Посьпехі МТС ва ўмовах жорсткага клясавага змаганьня сталі магчымымі толькі на аснове правядзеньня генэральнай лініі партыі, на аснове бальшавіцкай мабілізацыі волі, энтузіязму і творчай актыўнасьці калгасных бядняцка-серадняцкіх мас, на аснове бязьлітаснага змаганьня з кулацтвам і яго агентурай у партыі — правымі і «левымі» апартуністамі.

Грамадзкасьць у дапамогу МТС

МТС па спынілі сваёй дзейнасьці і па зімовы час. Трактары сьцягнуты ў цэнтральныя гаражы для рамонту.

Аднак, трэба адзначыць, што работа і будаўніцтва МТС праходзіць бяз патрэбнага ўдзелу пралетарскай грамадзкасьці. Некаторыя раённыя арганізацыі і установы да гэтага часу не павярнуліся тварам да МТС.

У радзе раёнаў МТС дагаворы не ўкамплектаваны дырэктарамі, аграномамі, ня вылучаны інструктары арг.-масавай работы, не хапае бухгальтароў і нават пізавых тэхнічных работнікаў, што затрымлівае складаньне агра-вытворчых плянаў, улік і рамонт трактараў, стварэньне і ачыстку насенных фондаў у калгасах.

Ва многіх раёнах мясцовыя арганізацыі да гэтага часу не пакладаціліся нават аб вызначэньні памяшканьняў для трактарнага парку і кантор МТС.

Рамонтная кампанія праходзіць нездавальняюча. З 518 трактараў, якія падлягаюць рамонту, адрамантавана, згодна афіцыяльным весткам, толькі 56. Такая марудныасьць у правядзеньні рамонту пагражае зрывам гэтай важнейшай работы. Не ўрэгулявана пытаньне з запаснымі часткамі.

Падрыхтаваць кадры

Падрыхтоўка кадраў для МТС, галоўным чынам, старайшых трактарыстаў, праводзіцца нездавальняюча. Курсы мэханікаў пры Койданаўскай МТС і Гарадоцкім прафтэхнікуме адкрыліся са значным спазьненьнем.

Зрываецца падрыхтоўка кадраў у раёнах дзейнасьці **Дубровенскай, Вушацкай, Расонскай, Жыткавіцкай, Будашкалёўскай і Старадароскай МТС.** Гэтыя МТС несваячасова былі ўкамплектаваны адміністрацыйна - гаспадарчым апаратам і работа курсаў не разгорнута.

Белкаапсаюз ня выконвае дагавору

Для пасьпяховага правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі, для бесьперабойнай работы магутнага трактарнага парку патрабуецца вялікая колькасьць гаручага і змазачнага матар'ялу. Патрэбны новыя нафтасклады і бакі. Патрэбна арганізаваць дастаўку гаручага з нафта-баз на вучастку саўгасаў і МТС.

Белкаапсаюз заключыў дагавор на пабудову на БССР каля 60-70 розных бакаў. Аднак, да гэтага часу Белкаапсаюз не пабудаваў яшчэ ні аднэй нафта-базы. МТС, такім чынам, яшчэ не забясьпечаны да веснавой пасеўнай кампаніі нафта-хавальнікамі. Такія «тэмпы» Белкаапсаюзу стварэюць небясьпеку ў сваячасовым і бесьперабойным забясьпячэньні МТС гаручымі і змазачнымі матар'ялямі.

Ня лепшая справа і з рэалізацыяй акцый на будаўніцтва МТС. Трактарацэнтр, вызначыў ліміт капітальных выдаткаў на будаўніцтва МТС у БССР у 6.930 тыс. руб. Сродкі гэтыя павінны паступіць ад рэалізацыі акцый. Аднак, цэлы рад раёнаў, як Асьвейскі, Заслаўскі, Чырвона - Слабодзкі, амаль што зусім не прыступілі да рэалізацыі трактарных акцый, ня гледзячы на кантрольныя заданьні, вызначаныя СНК і Наркамэмам.

Будаўніцтва МТС—на баявыя тэмпы

Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па правааапартуністычнай практыцы ў будаўніцтве МТС. Парада работнікаў МТС, якая адкрываецца пры Наркамземе, павінна намеціць практычныя мерапрыемствы па вынішчэньні ўсіх недахопаў у рабоце і будаўніцтве МТС.

Прафсаюзныя арганізацыі і асабліва саюз с.-г. рабочых амаль нічога ня робяць для мабілізацыі мас на пасьпяховае будаўніцтва МТС, для дапамогі ў заключэньні дагавораў.

Па лініі саюзу сельгасрабочых неабходна зараз-жа арганізаваць брыгады і прымацоўваць да МТС у дапамогу разгортваньня масавай работы і для пераводу работы МТС на баявыя тэмпы.

Райком саюзу, на тэрыторыі якога арганізуецца МТС, поўнасьцю адказвае за свячасовасьць арганізацыі і работу МТС.

Вытворчыя саюзы, паводле дырэктывы ЦСПСБ, павінны былі вылучыць рамонтныя брыгады для МТС. На сёньняшні дзень гэта важнейшая дырэктыва ў жыцьцё не праведзена.

Цэнтральныя арганізацыі і Наркамзем пакуль што абмяжоўваюцца пасылкай дырэктыў. Дапамога мясцом, жывая праверка выкананьня дырэктыў, цэнтральнымі арганізацыямі не праводзіцца.

Прафарганізацыі павінны павярнуцца тварам да МТС.

Н.

Саўгасы Белсельтрэсту

зрываюць рамонт трактараў

Да пачатку веснавой пасеўнай кампаніі трактарныя майстэрні Белсельтрэсту павінны выпусьціць з рамонту ня менш 100 трактараў. Ня гледзячы на каляндарны плян прысылкі саўгасамі трактараў і рад папярэджаньняў і тэлеграм з боку Белсельтрэсту, — кіраўнікі саўгасаў да гэтага часу вольмі марудзяць з прысылкай трактараў і с.-г. машын.

Між тым, майстэрні слаба нагружаны і на 24 студзеня ў рэзэрве засталіся для рамонту толькі 2 трактары і 1 матор. Такая нядбайнасьць з боку кіраўнікоў саўгасаў пагражае зрывам пляннавага рамонту.

Патрэбны тэрміновыя меры.

Маневіч.

Ленінскі прызыў ў калгасы

ХАЛОПЕНІЧЫ. (Наш кар.). У дзень сьмерці Леніна праведзены сходы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў, на якіх пастаўлены даклады аб рабоце Леніна, аб каапэрацыйным пляне Ільліча. У вёсках раёну створаны 2 новыя калгасы з 22 гаспадарак. У радзе калгасаў арганізаваны ўдарныя брыгады імя Леніна па выкананьні гаспадарчых задач.

МАРОЗ.

Расьце калгасны прыліў

Перавыбары праўленьняў калгасаў па Рэчыцкім раёне праводзіцца над лёзунгам новага прыліву ў калгасы. За першыя тры дні пераабрана 5 праўленьняў калгасаў і арганізавана два новых калгасы, у якія ўступіла 57 гаспадарак.

Пляны кантрактацыі

не аддзяляць ад плянаў веснавой сяўбы

Кантрактацыя тэхнічных культур у **Сураскім** раёне набывае выключнае значэньне, бо пасеўная плошча ільну ў Сурасьцыце павялічваецца сёлета на 6220 гэкт. (108 проц.) у параўнаньні з мінулым годам.

Пляны кантрактацыі бязумоўна могуць быць выкананы. Па-першае—таму, што ў большасьці раёнаў БССР летась быў значны ўраджай і ў асноўным мы забясьпечылі здатчыкаў праматаварамі. Па-другое—таму, што мы зараз даводзім пляны веснавой сяўбы да кожнай гаспадаркі. Нарэшце, надежнае ўкамплектаваньне раёнаў машынамі і мінэральнымі ўгнаеньнямі дае вялікі стымул для засеву тэхнічных культур.

На шляху 100 проц. ажыцьцяўленьня кантрактацыі ў нас будуць сустракацца і труднасьці. Яны заключаюцца, перш за ўсё, у кулацкай агітацыі вакол памылак мінулага году, калі часамі мелі месца адміністраваньне, ня было мацавасьці ў гэтай рабоце.

Кулак разводзіць такія гутаркі, што, маў, з пашырэньнем засеву ільну будуць павялічвацца цьвёрдыя заданьні адніваасобнікам, што яны будуць абкладацца на большую суму і таму ня варта сеяць лён.

У першыя часы асаблівых труднасьцяў можна чакаць з кантрактацыяй канапель. Згодна спрадвечнай традыцыі ў нас ніяк ня ўзьнімі малая сеяць гэту культуру. Прыдзецца адразу-ж распачаць масавую растлумачальную работу на калгасах і адніваасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках.

Калі мы ўскладзем увесь цяжар на плечы каапэрацыйнай сыстэмы, на Каапсаюз і Калгасасекцыю, дык вялікіх вынікаў не дачакаемся. Гэтым арганізацыям ня хопіць ні часу, ні магчымасьцяй складзі і аформіць усе дагаворы. Неабходна будзе ўвяцьць на дапамогу ім як мага больш раённых устаноў, мабілізаваць іх тэхнічны апарат на практычнае вырашэньне гэтай актуальнейшай задачы.

Трэба максымальна папулярызаваць адозву СНК СССР і ЦК УсесКП(б). Мы мяркуем ва ўмовах раёну арганізаваць **спэцыяльны «Дзень селяніна»,** правесьці сходы моладзі, на якіх абгаварыць пляны кантрактацыі тэхнічных культур у зьвязку з агульнай рэконструкцыяй нашай гаспадаркі.

Ні ў якім разе нельга аддзяляць плянаў веснавой сяўбы ад плянаў кантрактацыі.

Кожны селянін павінен ведаць, што канкрэтна ён атрымае да сяўбы і якія ільнаапрацоўчыя машыны будуць завезены ў раён.

Сакратар Сураскага РК КП(б)Б— БОТВАЎ.

Чырвонаармейцы—адпускнікі вывучаюць трактар

3-ці і 4-ы ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ

ПРАЛЕТАРСКІ МЕНСК ШЛЕ ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ У ГАРСАВЕТ

НАКАЗ ГАРСАВЕТУ—стаць баявым органам пралетарскай дыктатуры

НОВЫМІ КАЛЁНАМІ ЭНТУЗІЯСТАЎ ПЯЦІГОДКІ, ДЗЕСЯТКАМІ ЗАЯЎ У ПАРТЫЮ АДЗНАЧАЮЦЬ РАБОЧЫЯ ВЫБАРЧУЮ КАМПАНІЮ.—ЧЫГУНКА ДАЕ УЗОРНЫЯ ПРЫКЛАДЫ АКТЫЎНАСЬЦІ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Трэці і чацьверты дзень перавыбараў Менскага гарсавету таксама, як і першыя дні, прайшлі пад знакам вялікай актыўнасьці мас выбаршчыкаў, спаборніцтва прадпрыемстваў на лепшую яўку, на арганізацыю новых ударных брыгад, на дадатковую падпіску на пазыку.

Яўка на перавыбарчыя сходы хістаецца паміж 90 і 100 проц. (завод «Чырвоная зара»—99 проц., завод «Беларусь»—100 проц., «Вадаканалбуд»—97 проц. і г. д.). Узорны прыклад актыўнасьці зноў паказалі рабочыя чыгункі (службы шляху і дэпо), даўшыя 100 проц. яўкі.

У сотнях дадатнай да наказу рабочыя высоўваюць патрабаваньні да новага складу гарсавету—цясьней зьвязацца з прадпрыемствамі, павярнуцца тварам да патрэб рабочых акраін, іраваць барацьбой за прамфінпляну, працаваць ударнымі тэмпамі, памятаючы, што 1931 год—рашаючы год сацыялістычнага наступленьня.

Мандат дэпутата рабочыя гораду Менску даверяюць гэроям вытворчых будняў—рабочым-ударнікам, якія даказалі на справе сваю адданасьць сацыялістычнаму будаўніцтву, якія змогуць забясьпечыць перабудову работы гарсавету, ліквідаваць дапушчаныя апартуністычныя памылкі і прарывы.

Сярод выбраных—ударнікі, якія атрымалі прэміі за лепшую работу, якія маюць за сваёй сьпіной дзесяткі год рабочага стажу.

Спробы адыграцца на часовых труднасьцях, на асобных нелядах, на пачуцьці адсталых элементаў рабочай клясы, вялікадзяржаўныя выбрыкі (выступленьне рабочага Зяньводу—Хмялеускага супроць беларусізацыі) сустрэлі самы рашучы адпор.

Яны суправаджаюцца дэманстрацыяй давер'я рабочых мас да ленінскай партыі.

За трэці і чацьверты дні на сходах зноў паступілі дзесяткі заяў аб уступленьні ў партыю. Заявы прасякнуты ўсямернай гатоўнасьцю пралетарыяту аддаць усе сілы выкананьню гістарычных задач трэцяга рашаючага году.

Выбары яшчэ раз даказалі ўзрослую палітычную актыўнасьць рабочых Менску, іх адданасьць генеральнай лініі партыі, наказам Уладзімера Ільліча.

У той-жа час трэба адзначыць, паводле папярэдніх даных, яўную пагрозу невыкананьня дырэктыў партыі аб уцягненьні работніц у саветы. На радзе буйных прадпрыемстваў вельмі мала работніц выбрана ў Менгарсавет («Энергія», «Камунар», чыгунка і г. д.).

Трэба на-ходу выправіць дапушчаныя памылкі.

У заключэньне некаторы слоў аб рабоце гарадзкой выбарчай камісіі. Камісія адарвалася ад прадпрыемстваў, ніякіх дакладных вестак аб ходзе выбараў у яе няма, уліч яўкі, колькасьці выбраных, сацыяльнага і партыйнага складу дэпутатаў не арганізован.

Мы ніяк зусім ненармальным такое становішча. Нельга іраваць ходам выбараў, нельга выпраўляць на-ходу памылкі, ня маючы ніякіх даных аб ходзе кампаніі. Чаму гарадзкая выбарчая камісія ня можа дабіцца, каб не упаўнаваманыя кожны дзень давалі весткі аб ходзе выбараў на прадпрыемствах?

Гарадзкая выбарчая камісія, ня і мінулае іраўніцтва гарсавету, адстае ад тэмпаў перавыбарчай кампаніі, праяўляе апартуністычную недацэнку перавыбараў, хварэе бюракратычнай непаваротлівасьцю і кнігабіясьцю. Гарадзкая выбарчая камісія павінна зараз-жа перабудаваць сваю работу.

Прышоў увесь калектыў

У новым складзе прышлі рабочыя завода «Беларусь» на перавыбарчы сход. Прышлі паваг і тыя, хто знаходзіцца ў адпачынку.

20 рабочых прапаноў—уклад рабочых завода «Беларусь» у новы паказ гарсавету. Асаблівая ўвага аддана пытаньням узмацненьня абароназдольнасьці краіны.

— У нарыд гарсаветаўскага сацыялістычнага наступленьня мы на ножам стаяць у баку—просім прыняць нас у рады партыі, — заявілі 4 ударнікі, падаўшыя заявы ў бюро ячэйкі.

Завод «Беларусь» паслаў у Менгарсавет 2-х дэпутатаў, якія змогуць змагацца за рэвалюцыйныя тэмпы, за выкананьне прамфінпляну.

У рады ленінскай партыі

Пад бальшавіцкім іраўніцтвам ЦК будзем змагацца за сацыялізм

80 проц. выбаршчыкаў зьявілася на перавыбарчы сход на заводзе «Ударнік». 110 прапаноў, сабраных камісіяй самакрытыкі работы гарсавету, прайшло абмеркаваньне наказу. Кожны разьдзел выклікаў жвавыя спрэчкі і шмат дадатнаў.

Унесена больш 50 розных прапаноў.

Рабочыя «Вадаканалізацыі» лічаць патрэбным, каб гарсавет пабудаваў дом-камуну для моладзі, пабудаваў камунальныя купальні, правёў каналізацыю на гарбарні «Бальшавік», забрукаваў гр[illegible]ія вуліцы акраін.

Вельмі актыўна абгаварваліся кандыдатуры. У склад гарсавету выбраны членам т. Сацукевіч—малады вадаправодчык, камсамолец, ударнік, кандыдатам—беспартыйны рабочы Гатальскі, пе[illegible] ударнік, з 15-гадовым рабочым стажам.

На сходзе 9 старых рабочых падалі заявы аб прыёме ў партыю. «Пад іраўніцтвам ленінскага ЦК у радах партыі мы будзем змагацца за канчатковую перамогу сацыялізму»,—заявілі яны.

АГРАНАЎ.

97% выбаршчыкаў на сходзе

Вельмі актыўна абгаварваўся наказ

З двухгадзінным спазьненьнем пачаўся сход рабочых, інжынэрна-тэхнічнага персаналу «Вадаканалізацыі». 97% выбаршчыкаў прышлі на сход.

Вельмі актыўна, ва ўмовах разгорнутай самакрытыкі работы гарсавету, прайшло абмеркаваньне наказу. Кожны разьдзел выклікаў жвавыя спрэчкі і шмат дадатнаў.

Унесена больш 50 розных прапаноў.

Рабочыя «Вадаканалізацыі» лічаць патрэбным, каб гарсавет пабудаваў дом-камуну для моладзі, пабудаваў камунальныя купальні, правёў каналізацыю на гарбарні «Бальшавік», забрукаваў гр[illegible]ія вуліцы акраін.

Вельмі актыўна абгаварваліся кандыдатуры. У склад гарсавету выбраны членам т. Сацукевіч—малады вадаправодчык, камсамолец, ударнік, кандыдатам—беспартыйны рабочы Гатальскі, пе[illegible] ударнік, з 15-гадовым рабочым стажам.

На сходзе 9 старых рабочых падалі заявы аб прыёме ў партыю. «Пад іраўніцтвам ленінскага ЦК у радах партыі мы будзем змагацца за канчатковую перамогу сацыялізму»,—заявілі яны.

АГРАНАЎ.

Вышэй узьняць сьцяг ударніцтва

На выбарчы сход драўжавога заводу «Чырвоная зара» зьявілася 99 выбаршчыкаў. Абгаварэньне наказу гарсавету 13-га скліканьня прайшло пры вялікай актыўнасьці рабочых. Большасьць дадатнаў датычыць пытаньняў паляпшэньня дабрабыту акраін і жыльлёвага будаўніцтва. Рабочыя «Чырвонай зары» на справе даказалі сваю адданасьць партыі Леніна. 6 лепшых ударнікаў падалі заявы аб уступленьні ў рады партыі.

У наказе гарсавету калектыў узяў на сабе абавязак — шчэ вышэй узьняць сьцяг сацыяспаборніцтва і ўдарніцтва і пад іраўніцтвам ленінскай партыі пайсьці наперад да новых перамог.

У гарсавет выбраны два дэпутаты — рабочыя-ўдарнікі.

Наказ заводу „Пралетары"

23 студзеня ў клюбе заводу «Пралетары» сабраліся выбаршчыкі 4-х калектываў; драўжавога заводу „Пралетары", Беларускага „Сельгаспрамаб" адзначыць. Сход пачаўся са спазьненьнем на адну гадзіну. Прышло 95% выбаршчыкаў (на ўлічаных камандзіраванных і хворых).

Да наказу дадана шмат прапаноў.

Калектывы петрабуршы—правесьці прамайную лінію па Ляхаўку, дзе жыве шмат рабочых і дзе знаходзіцца найбольш буйных прадпрыемстваў; пасьпіць в дамоў кампасу пабудаваных выбарных прагоў, пабудаваць у 1931 годзе адзін дом-камуну; устанавіць [illegible]ітэты прасы у трамваях для вучняў, зьвяліць [illegible] і дзень прэсы на радзе прыдаць, пабудаваць дом адпачынку для ударнікаў. Піянеры з свайго боку ўнесьлі прапановы—адкрыць дзіцячы клюб і тэатр і забясьпечыць вучняў—дзяцей бедняк одзеньнем, абутнем і гарачым сьнеданьнем.

У гарадзкі савет выбраны таварышы: Тышберг—нам. майстра заводу „Пралетары"—30-гадовы рабочы стаж, прэміраваны ударнік, кандыдатам выбран тав. Асіпчук—рабочы-мэ[illegible] з 20-гадовым рабочым стажам.

БІРЫГАДЗІР АГРАНАЎ.

Спаборніцтва

на лепшае правядзеньне перавыбараў

Бюро парткалектыву Менбудтрэсту *выклікала парткалектывы Белдзяржбуду і Белжылсаюзу на спаборніцтва па правядзеньні перавыбарчых сходаў.*

У сацдагавор унесены наступныя пункты: шырокае растлумачэньне сярод рабочых значэньня перавыбараў, найлепшы збор прапаноў да наказу гарсавету, удзел усіх рабочых у абмеркаваньні кандыдатуру у склад гарсавету і наказу, 100-процантная яўка рабочых, служачых, тэхнарсаналу і ўтрымальцаў на перавыбарчыя сходы.

МАНДАТ ЧЫГУНАЧНІКАЎ—байцам за пяцігодку

23 студзеня выбіралі ў гарсавет рабочыя і служачыя службы шляху і дэпо Менск—таварная. На сход зьявілася каля 120 проц. усяго складу. (Прышлі рабочыя, якія ў гэты дзень знаходзіліся ў адпачынку).

Пасьля дэтальнага абгаварэньня наказу сход прапанаваў сваім дэлегатам у новы склад гарсавету дабіцца пракладкі трамвайнай лініі да чыгуначнай больніцы, забрукаваньня Мала-Сяргеўскай вуліцы, па якой возяць цэглу з заводу, капітальнага ліквідацыі прарывы ў забясьпечэньні гораду гарадзінай і дрывамі, прыцягнуўшы вінаватых да адказнасьці, павялічыць лік дрывяных складаў, пабудаваць амбулаторыю у чыгуначным раёне, правесьці электрычнасьць у рабочыя кватэры. Гарсавет павінен рабіць нарыхтычныя справаздачы перад выбаршчыкамі на прадпрыемствах.

Дэпутатамі выбраны: тав. ГАРАЎСКІ—рабочы-ударнік, з 30-гадовым вытворчым стажам, член КП(б)Б; тав. МУРАЧ—рабочы-ударнік, з 8-гадовым стажам, член КП(б)Б; кандыдатам выбрана работніца-ўдарніца тав. УРБАН—канд. партыі.

У сацыяспаборніцтве на лепшую яўку на выбарчы сход рабочыя дэпо і службы шляху не «падкачалі».

С—і.

Пачаць будаўніцтва дамоў-камун

Рабочыя-будаўнікі Белмалгасбуду і ваенведу паказалі ўзорны прыклад актыўнасьці.

На сход, прысьвечаны перавыбарам Менгарсавету, прышло 98 проц. рабочых.

Наказ гарадзкога савету абгаварваўся вельмі актыўна—паступіла 120 дадатнаў да наказу, з якіх прынята 72.

Будаўнікі патрабуюць ад Менгарсавету—асьвятліць кватэры рабочых, якія жывуць на акраінах гораду, скончыць пабудову вузка-калейкі ад таварнай станцыі да першай цагельні, пабудаваць студні на акраінах гораду; павялічыць колькасьць гарадзкіх гадзіньнікаў; адкрыць новыя крамы на Серабранцы; узмацніць іраўніцтва і кантроль над дамамі жактаў.

— Гарсавет мала займаўся пытаньнямі рабочага забясьпечэньня—трэба адкрываць сталоўкі ў раёнах разгорнутага будаўніцтва. Гарсавет ня ўлічваў ізкненьня рабочых да аграмаджэньня быту—дамы-камуны не будаваліся, праводзіўся курс на індывідуальнае будаўніцтва.

Гарсавет павінен строга зачэпіць за тым, каб у навучальныя ўстановы не пралазілі клясава-чужыя элементы.

Трэба практыкаваць пленумы прэзыдыуму на прадпрыемствах, важнейшыя мерапрыемствы абгаварваць на шырокіх рабочых сходах.

— Будаўнікі,—заявілі выступаўшыя рабочыя,—з усёй энэргіяй будуць змагацца за выкананьне прамфінпляну, яны чакаюць дапамогі і іраўніцтва гарадзкога савету.

Мандаты дэпутатаў гарсавету атрымалі: т. т. Грыцэль—член КП(б)Б, іраўнік будаўніцтва ваенведу, тав. Гольдзэрг—рабочы-ўдарнік, сьлесар з 25-гадовым вытворчым стажам, член КП(б)Б, т. Сідаровіч—сакратар парткалектыву будаўніцтва ваенведу. Кандыдатам выбран т. Войцэх—беспартыйны рабочы-ударнік з 22-гадовым рабочым стажам.

М. Сакалоўскі.

Паведамленьні

СЁНЬНЯ:

— Культпроп ЦК КП(б)Б 26-1 31 г., у 18 гадз. склікае нараду па пытаньні правядзеньня дэкады штурму па ліквідацыі прарываў у галіне ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі непісьменнасьці. Неабходна зьявіцца пасьпушным т. т.: НКА — Платуп, Ерафеў, Дашкевіч і Сьцепанюк, Белжаансаюз — Гінзбург і Туркевіч, Белжалгасцэнтр—Кірнэс, Наркамзем — Шушкевіч, Сампрамсаюз — Эфрон, Дзяржлізм—Маньяс, загадчыкам культмасавых сэктароў усіх ПП саюзаў, загадчыкам культ-масав. адд. усіх цэнтральных газэт, іраўнікам культ-масавай працы: Белдзяржкіно, ВОПГВ, Камітэт на справах друку, БДВ і Белжылсаюз.

— Камвуз. У 19-й гадз. у памяшканьні ленінскага габінету Камвузу (Університэцкая, 27) адбудзецца пасяджэньне Т-ва гістыкаў-марксыстаў.

У нараду дня — праніг спрэчак на даклад т. Дудзінаў аб пашанійскім перыядзе.

Прысутнасьць членаў т-ва і асьпірантаў абавязкова. Запрашаюцца таксама партыйныя актывы і выкладчыкі гісторыі.

— Дом Камасьветы. У 19 гадз. — групавая кансультацыя для прапагандыстаў вясковых начальных школ — «Індустрыялізацыя — асноўны матар сацбудаўніцтва». У 10 гадз. ран., пак. 24 — заняткі сэмінара рабочых прапагандыстаў сеткі партасьветы.

— Дом Асьветы. У 17 гадз. — агульны сход калектыву ЛКСМБ, прапасьветы.

— Клюб навуковых працаўнікоў. У 20 гадз. — пасяджэньне культмасавага сэктару ПБ СНП, разам з саветам клюбу навук. прац. і з брыгадамі на абсьледаваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва па ВНУ і навук. дасьледчых установах.

— Антырэлігійны унівэрсытэт. У 19 гадз. у пам. Унівэрс. гарадзка, гал. корп., 1-шы паверх, пак. 112 — адбудзецца пятніцкі антырэлігійнага унівэрсытэту.

ЗАЎТРА:

— БДУ. У 20 в паловай гадз. у аўд. 317 гал. корпусу — закрыты партыйна-камсамольскі сход партгасу БДУ.

— Клюб цэнтральных майстэрняў Белдзяржбуду (Грыгораўская, 2) у 19 гадз. — адкрыты сход парткалектыву Белдзяржбуду. Запрашаюцца беспартыйныя рабочыя і тэхн. персонал.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Родныя і галоўная кантора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ

Рэдактар . 13-80 | Начны рэдактар . 6-47
Сакратар . 10-34 | Галоўная кантора 7-81
Сэктар інфармацыі . 6-19 | Адрэс падпіскі . 7-81
абаненты . 7-81

Умовы падпіскі (з дарожным дадаткам „Прафрух")

На 1 мес. . . . . — 1 р.
„ 3 мес. . . . . — 3 „
„ 6 мес. . . . . — 6 „
„ 12 мес. . . . . — 12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на месцах.

Цэна за абвесткі:

За радок нонпарэль тэксту—95 к., пасля гарадзкім абвесткі—6 р. за радок. Пасярэдзіне тэксту—у два разы дарожэй. При кампаніях дружаньня—скідка. Звыш гарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. падатку.

Абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газэты „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 2-гі паверх тэл. 7-81. 63

КІНО-ТЭАТР ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА

СЁНЬНЯ, 26 СТУДЗЕНЯ — ПРЭМ'ЕРА

Лепшы савецкі фільм сэзону 1931 г. вытворчасьці „Саюзкіно" (трэсту Белдзяржкіно)

РУБІКОН

ДРАМА Ў 7-МІ ЧАСТКАХ

Сцэнары А. МЕНСКАГА. Апэратар і асыстэнт КАЛЬЦАТЫ.
Рэжысэр—ВАЙНШТОК. Кансультанты: БРАДЗЯНСКІ і А. МЕНСКІ.
Мастакі: ФЭДАР і ПАКРОЎСКІ.

Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 хв., і 10 г. 30 хв.)—(Касы адкрыты з 5 гадз. веч.

Папярэдні продаж білетаў па калектыўных заяўках штодзенна ў тэатральнай рабочай касе з 12 да 2 гадз і з 4 да—6 гадз. веч.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА"

Ад панядзелка, 26 студзеня

— НОВЫ ФІЛЬМ —

вытворчасьці „САЮЗКІНО"

Вецер з парогаў

Кіно-аповесьць в 7-мі частак

Рэжысэр Курдзюм Апэр. А. Рона

—Звыш праграмы—

ВЯЛІКІ КАНЦЭРТ

1. ЭМІЛЬ КЕМПЭР

Лепшы гітарыст. Новы злобадзённы р. ыпртуар.

2. 2 ЖЭРВЭ 2

ТАНЦ-ЖОНГЛЕРЫ

ПАЧАТАК у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.)—(Касы—в 5 гадз.

Тыя, хто спозьняцца, на сэанс не дапускаюцца.

БЕЛАРУСКАЕ КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ,

на падставе выпуску Наркамшляхтэлю ад 28-30 лістапада 1930 году № 4-521, абвяшчае, што

КАМІТЭТАМ СТАНДАРТЫЗАЦЫІ

пры СПА ўстаноўлены

СТАНДАРТНЫЯ РАЗЬМЕРЫ ДЛЯ ЛІСТОЎ І ПАШТОВЫХ КАРТАК,

таму прыняв пісьмовых адпраўленьняў нестандартных разьмераў, а таксама на паперовай паперы, не ўложаных у канверт, з 1-га лютага 1931 году не будзе праводзіцца ўсімі п.-т. установамі БССР.

Стандартныя разьмеры канвертаў 229х162 і 162х114 м.-м., картак 148х105 м.-м. на плетвай паперы.

Мінімальныя разьмеры лістоў і бандэролей з друкаванымі творамі і дзелавымі паперамі 114х81 м.-м.

При рассылках розных абвестак раіцца карыстацца стандартнымі паштовымі карткамі.

Адпраўленьні, якія на будуць адпавядаць гэтым разьмерам або адзавацца не ўложанымі ў канверты, будуць ВАРОЧАЦЦА НАЗАД АДПРАВІЦЕЛЯМ (установам і прыватным асобам).

Менскае кіраўніцтва кадраў прапануе усім прадпрыемствам і ўстановам гор. Менску

ПАДАЦЬ ПЛЯНЫ

патрэбнасьці і пакрыцьця рабсілы 1931 г. да 1-га лютага г. г.

Пры гэтым вестці павінны прысылацца незалежна ад таго патрэбуецца ў гэтым годзе дадатковая рабсіла ці не. Пляны павінны быць складзены па форме, згодна пастановы Наркампрацы, абвешчанай у газэце „Савецкая Беларусь" ад 9-I г. г., з наступнымі вызначэньнямі на форме № 1:

Графа 36—37 трэба лічыць сямёю рабочых і служачых.

Графа 38—39 батрані
„ 40—41 беднякі і валасьныя
„ 42—43 іншыя, якія маюць права на рэгістрацыю біржы працы.

Форма № 3.

Графа 12 трэба лічыць батракоў
„ 13 — сямёю рабочых і служачых і іншых, якія маюць права на рэгістрацыю.

У пляны паказваецца толькі тая рабсіла, якая будзе занята (або зараз занята) на прадпрыемствах г. Менску. За непадачу пляну да тэрміну або не па форме будзе накладзен штраф на кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў асабіста.

Нам. заг. кіраўніцтва кадраў г. Менску Юнцо.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ" прымаюцца да 2 гадз. дня

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр

Сёньня, 26 студзеня—для сэкцыі саўгандэльслуж

„ПЕРШАЯ КОННАЯ"

Пачатак у 8 гадз. веч.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"

Ад панядзелка 26-га студзеня

АМЭРЫКАНСКІ ПРЫГОДНІЦКІ ФІЛЬМ

НАЧНЫЯ КРЫК

У гал. ролях:
Ж. МАРЦІН,
ЭЛЕН МАРКОЎ,
ЛЮІ ХАРОН і аўчарка РЫН-ЦІН-ЦІН

Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз., 2-га—7 г. 30 хв., 3-га—9 г., 4-га—10 г. 30 хв.

Касы адчынены з 4 гадз. 30 хв.

КІНО „СПАРТАК"

З понядзелка, 26 студзеня

БАЙЦЫ

Барацьба гігантаў

драма ў 10 частках.

Пачатак сэансу: 1 с.—7 г., 2 с.—9 г., 3 с.—11 г.

Касы—з 5 гадзін.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

Сёньня і штодзенна мастацкі фільм

ЧАЛАВЕК З РЭСТАРАНУ

Рэжысэр Пратазанаў.

У ГАЛ. РОЛЯХ:

заслужаны артыст рэспублікі І. Д. Чэхаў,
Н. С. Малінаўская,
І. І. Мазаль-Самборскі,
і заслужаны артыст рэспублікі М. С. Гаронаў,
А. С. Кузьнецоў.

Звыш праграмы: КІНО-НАВІНЫ у 2-х частках

НАШ УКЛАД У ПЯЦІГОДКУ

Вытворчасьці сэктару палітасьветфільмаў Белдзяржкіно

Пачатак 1-га сэансу—у 6 гадз.

Каса адчынена з 4 гадз. 30 хв.

КІНО „Юны Піянэр"

Лепшы гістарычны фільм вытворчасьці „Совкіно"

ДВА БРАНЯВІКІ

ў 6 частках

Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня

Каса адчынена з 12 гадз. дня.

ПОЛАЦКІ СЕЛЬСКА-БУДАЎНІЧЫ ТЭХНІКУМ

абвяшчае

што ПРЫЁМ 60-ці асоб на першы курс ПРАЦЯГНУТ

да 10-га лютага 1931 г.

Заявы і дакументы можна дасылаць, згодна раней апублікаваных умоў прыёму (гл. «Зьвязду» ад 11 і 12 студзеня г. г., «Савецкую Беларусь» ад 13-I і «Чырвон. Полаччыну» ад 15-га студзеня).

Дырэктар тэхнікуму АЗІРСКІ.

Усім партканектывам і ячэйкам.

Згодна пастановы бюро гаркому ад 12 студзеня, першыя арганізацыйныя заняткі на вячэрніх курсах гарпартактыву адбудуцца

28-га студзеня у 7 гадз. веч., у залі пасяджэньняў гаркому (3-ці паверх) Усе таварышы, якія вылучаны ячэйкамі на курсы і якія запісаліся, павінны зьявіцца абавязкова і без спазьненьня.

УСЕ СТУДЭНТЫ

леса-тэхнічнага інстытуту і лясных тэхнікумаў,

якія знаходзяцца ў адпачынку,

павінны зьявіцца да 28-г. студзеня 1931 г. у свае навучальныя ўстановы

ДЛЯ НАКІРАВАНЬНЯ НА ВЫТВОРЧАСЬЦЬ,

згодна загаду Саюзлеспрому, № 11.

Студэнты, якія зараз працуюць на вытворчай практыцы, застаюцца на працы да паведамленьня.

За кіраўніка Лесбелу СЬВІРЫДАЎ.

Дырэктар Бел. дзярж. леса-тэхн. інс-ту ГРАНКОЎСКІ.

Ня гледзячы на гаспадарча-палітычную важнасьць, якую набывае зараз пастанова НКП СССР і БССР аб звароце былых чыгуначнікаў на чыгунку, да гэтага часу з боку большай часткі ўстаноў і прадпрыемстваў праяўляецца недапушчальная маруднасьць у справе дачы вестак мясцовым органам працы і г. д.

НАРКАМПРАЦЫ БССР апошні раз папярэджвае

прапануе пад асабістую адказнасьць усіх кіраўнікоў устаноў і прадпрыемстваў прыступіць зараз-жа да практычнага выкананьня пастановы НКП БССР, зьмешчанай у газэтах „Зьвязда", ад 21 студзеня 1931 г. „Савецкая Беларусь", і „Рабочий"

Нам. Наркампрацы БССР Д. ЗАХАРАВА.

Згубленыя і украдзеныя дакументы

лічыць несапраўднымі

Чл. біл. с. мэт., вайск. кн. Мен. ваенк. Сурко М. С., 3731-3732; вайск. кн. Мен. ваенк. Рудніцкага М. Я., 3733; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Рудзінскай З. М., 3794; чл. біл. Дому Пісьм. Плашчынскага І. П., 3735; камс. біл. № 86565 Мен. АК ЛКСМБ, чл. біл. с. харч. Сысоева П. Ц., 3736-3737; чл. біл. № 1806 с. прасьвет. Пракаповіча З. С., 3742 пасьв. аб скарч. ЦПП Грэбенчык Ф. М., 3743; дав. аб пр. Рубіл. с.-с. Вапечка З. У., 3744; 2 тал. на прамтав. Шамет В. Я., 3745; канд. карт. № 888 УсеКП(б) Новасельцава Ф. В., 3746; канд. карт. № 31096 Барыс. РК КП(б)Б Пушкець Я. К., 3747; пасьв. Мен. ЦПП, мэтр. вып. Самаув. ЗАГС, пасьв. аб скарч. 4 кл. Самахв. 7-годкі, квіт. буд. адд. МЦРК, дав. аб пр. буд. адд. МЦРК Фрыдмана А. Э., 3748-3752; вайск. кн. Мен. ваенк. Палянчука М. Ю., 3753; мэтр. вып. Астр.-Гар. РВК Абрамовіч М., 3754; дав. аб сан. стан. Астр.-Гар. с.-с. Андрыеўская М. Я., 3755; чл. біл. с. харч. Шкапенка І., 3756; вайск. кн. Мен. ваенк. Анефрэтара А. Р., 3757; чл. біл. с. буд. № 6922 Рымера А. І., 3758; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Стаповіча В. Я., 3759.

Менск, друкарня «ЗЬВЯЗДЫ».

Менск, Галоўлітбел № 337.